

НЕ ПЕРАРВЕЦЦА СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

МС

ЯКІМ ЧАКАЕЦЦА СЕЗОН ГРЫПУ І ПРАСТУД?

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 СНЕЖНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 250 (29872)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**ЛІЧБА ДНЯ**

**42 %**

*уведзенага ў краіне ў студзені — лістападзе жылля пабудавана для маючых патрэбу, паведаміў Нацыянальны статыстычны камітэт. У студзені — лістападзе 2022 года арганізацыямі ўсіх форм уласнасці здадзена 39,4 тысячы новых кватэр. Уведзена ў эксплуатацыю 3476,5 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля. Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, пабудавана 1460,4 тысячы кв. м агульнай плошчы, або 42 працэнты ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. Для грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, з выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі здадзена 1111,2 тысячы кв. м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 1030,8 тысячы кв. м агульнай плошчы жылля, або 29,7 працэнта ад агульнага ўводу па краіне.*

**КОРАТКА**

- **У Беларусі скарэкціраваны парадак спісання курсавых розніц.**
- МАРГ: перад Новым годам у крамах будзе хапаць тавараў у шырокім асартыменце.
- **У Магілёўскай вобласці пасля праверкі КДК да адказнасці прыцягнуты 30 работнікаў аховы здароўя.**
- Паказы навагодняй казкі «Сузор'е зубра» стартуюць 24 снежня ў Палацы Рэспублікі.
- **У Беларусі пры будаўніцтве жылля выкарыстоўваецца да 90 працэнтаў матэрыялаў айчыннай вытворчасці.**

# Першая ёлка ў новым доме



Фота БелТА.

Оля МАСКАЛЁВА з Лёзна, як і ўсе дзеці, з радасцю і прадчуваннем свята чакае Новы год. Для дзяўчынкі ён абавязкова будзе асаблівы і незабыўны, гэта дакладна. Бо свята яна і тры яе названыя сястрычкі — выхаванкі сямейнага дзіцячага дома — разам з бацькамі-выхавальнікамі Зояй і Іванам Маскалёвымі сустрэнуць у новым двухпавярховым катэджы. Сямейны дзіцячы дом, першая ўстанова такога тыпу ў раёне, адкрыўся акурат у дзень старту традыцыйнай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці».

Энергетыка

## ГАЗ, ТОРФ І СВЯТЛО

### Для беларусаў і не толькі ў рамках саюзных і нацыянальных праграм

**Другі энергаблок БелАЭС, які зараз гатовы на 97 %, энергетыкі плануюць запусціць ужо ў першым квартале 2023-га, а да 2025 года плануецца ўвесці ў эксплуатацыю каля 2 млн м² шматкватэрных электрадамоў. Пры гэтым выкарыстанне электраэнергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння ў краіне сёлета вырасла амаль удвая (1,8 раза), дасягнуўшы 396,4 млн кВт·г. Працягваецца рэалізацыя праграмы імпартазамяшчэння ў энергетыцы, асвойваюцца новыя рынкі экспарту тарфяной прадукцыі, вядуцца перагаворы з расійскім бокам аб фарміраванні адзінага рынку газу. Пра напрамкі і перспектывы развіцця энергетычнай галіны Беларусі расказаў міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ.**

### Першы энергаблок працуе, другі — рыхтуецца, трэці — аналізуецца

Сёлета ў Беларусі ўведзена ў эксплуатацыю 135 МВт генерыруючых магутнасцяў. Мадэрнізаваны і збудаваны новыя высокатэхналагічныя высакавольтныя падстанцыі ў Брэсцкай, Гродзенскай, Мінскай абласцях, рэканструявана і ўзведзена больш за 1,3 тысячы кіламетраў электрасетак, агучыў міністр:

— Праведзеная мадэрнізацыя аб'ектаў энергасістэмы, назапашаны вопыт, а таксама вытворчы і тэхналагічны патэнцыял забяспечваюць дынамічнае развіццё галіны. Працягваецца мадэрнізацыя электрасеткавай інфраструктуры, рэалізоўваюцца найважнейшыя інвестыцыйныя праекты.

СТАР. 3

Сезонны клопат

## Не страшны нам ні снег, ні сцюжа

**«Эх, дарогі, снег і туман»... У апошніх умовах надвор'я гэтыя радкі вядомай песні, перакладзеныя на народны лад, набываюць асаблівы сэнс. Зіма па поўнай уладарыць у краіне, засцілае белым покрывам усё, дзе ступае і не ступае нага чалавека. Гарачая пара цяпер у работнікаў камунальных службаў, якія штодзень няспынна выходзяць на барацьбу са снегам. Мы правялі адзін дзень з кіроўцам жыллёвага рамонтна-эксплуатацыйнага прадпрыемства Віцебскага раёна Дзянісам УЛАСЕНКАМ і даведаліся, чаму вулачкі населеных пунктаў па некалькі дзён застаюцца непраходнымі.**

Мароз і сонейка — дзень цудоўны. Накіроўваюся на сустрэчу з байцом «снежнага дэсанта» Дзянісам у вёску Андронавічы Віцебскага раёна. Чакаю ўбачыць ужо звыклы для сельскай мясцовасці трактар, але на гарызонце з'яўляецца велічэзны, 8,5-тонны сіне-аранжавы МАЗ. Такіх, дарэчы, у ЖРЭПе два, і абодва — новыя. Залезці ў кабіну — справа для дзяўчыны сярэдняга росту нялёгкая, але агульнымі намаганнямі мне ўсё ж такі ўдалося заняць пачэснае пасажырскае месца побач з кіроўцам.

СТАР. 3

**Кожны дзень – з любімай «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2023 г., — у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.**




ISSN 1990 — 763X

22250

Парламенцкі дзённік

# ДЗЕЛЯ ЗГОДЫ Ў ГРАМАДСТВЕ І ПАВЫШЭННЯ ДАБРАБЫТУ НАСЕЛЬНІЦТВА

## У першым чытанні дэпутаты разгледзелі законапраект «Аб Усебеларускім народным сходзе» і канчаткова адобрылі бюджэт на наступны год

**Парламентарыямі працягваецца работа па ўдасканаленні заканадаўства ў развіццё Асноўнага Закона краіны — Канстытуцыі. Шэраг найважнейшых законапраектаў былі разгледжаны падчас чарговага пасяджэння дзявятай сесіі Палаты прадстаўнікоў. Найбольш рэзанансным з іх — праект Закона «Аб Усебеларускім народным сходзе».**

### Новы інстытут улады

Праект закона, унесены ў Палату прадстаўнікоў старшынёй Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святланай Любецкай, змяшчае палажэнні, накіраваныя на комплекснае вызначэнне парадку фарміравання Усебеларускага народнага сходу і рэалізацыю ім сваіх паўнамоцтваў, прынцыпаў і арганізацыйных асноў яго дзейнасці, механізмаў разгляду пытанняў, аднесеных да кампетэнцыі УНС. Законапраектам замацоўваецца прававы статус дэлегата УНС, удакладняюцца яго правы і абавязкі. Улічваюцца канцэптуальныя падыходы да фарміравання і дзейнасці Усебеларускага народнага сходу, яго структуры, кампетэнцыі, паўнамоцтваў яго органаў, устаноўленых Канстытуцыяй. Дзеля захаванасці прынцыпу сістэмнасці і комплекснасці прававога рэгулявання грамадскіх адносін, звязаных з дзейнасцю УНС, законапраект прадугледжвае карэкціроўку шэрагу дзеючых законаў.

— У адпаведнасці з абноўленай Канстытуцыяй, народ удзельнічае ў вырашэнні дзяржаўных спраў у формах і рамках, устаноўленых Асноўным Законам, — звярнула ўвагу **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ.** — Невыпадкова абноўлены тэкст Канстытуцыі быў дапоўнены спецыяльнай главой, якая прысвечана новаму інстытуту з яго функцыямі, накіраванымі на забеспячэнне сістэмы стрымлівання і проціваг у палітычнай сістэме — Усебеларускаму народнаму сходу. У нас ёсць вопыт правядзення такіх сходаў, але з улікам тых задач і выклікаў сучаснага жыцця патрабавалася не толькі абнаўленне, але і ўдасканаленне яго заканадаўчага рэгулявання.

Парламентарый нагадала, што УНС не мае права ўмешвацца ў работу іншых органаў, падмяняць іх функцыі. Асноўныя задачы Усебеларускага народнага сходу, па словах Святланы Любецкай, — згода ў грамадстве, вырашэнне стратэгічных пытанняў, якія датычацца сацыяльна-эканамічнага развіцця, палітычнай стабільнасці і нацыянальнай бяспекі.

### У інтарэсах дзяржавы і грамадзянскай супольнасці

У першым чытанні дэпутацкім корпусам быў разгледжаны і яшчэ адзін найважнейшы законапраект — «Аб асновах грамадзянскай супольнасці». Праект закона накіраваны на кансалідацыю намаганняў асобы, грамадства і дзяржавы па рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь.

У прыватнасці, законапраектам прапануецца вызначыць паняцці «грамадзянская супольнасць» і «суб'екты грамадзянскай супольнасці», замацаваць прынцыпы ўзаемадзеяння дзяржавы і грамадзянскай супольнасці, устанавіць асноўныя задачы ўзаемадзеяння дзяржавы і суб'ектаў грамадзянскай супольнасці. Акрамя таго, рэгламентуюцца спосабы садзейнічання дзяржавы развіццю грамадзянскай супольнасці, дэталізуюцца асобныя формы ўзаемадзеяння дзяржавы і суб'ектаў грамадзянскай супольнасці.

У першым чытанні адобраны праект Закона «Аб змяненні закона Рэспублікі Беларусь «Аб нарматыўных прававых актах». У прыватнасці, законапраектам замацоўваецца статус Усебеларускага народнага сходу ў якасці суб'екта права заканадаўчай ініцыятывы, а таксама вызначаецца, што ў склад заканадаўства ўваходзіць шэраг рашэнняў Усебеларускага народнага сходу. З улікам актыўнага ўкаранення сучасных тэхналогій у розныя сферы дзяржаўнага кіравання артыкул 6 закона («Асноўныя прынцыпы нарматворчай дзейнасці») дапоўнены прынцыпам лічбавізацыі нарматворчай дзейнасці.

Другое чытанне прайшлі праекты законаў, якія датычацца змяненняў у заканадаўстве аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь, статусе дэпутата Палаты прадстаўнікоў, члена Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, аб Савеце міністраў нашай краіны.

### Бюджэт: збалансаванасць і сацыяльная скіраванасць

У другім чытанні парламентарыямі прыняты праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання». Дакументам прадугледжваюцца сістэмныя меры па ўдасканаленні падатковага заканадаўства з улікам вынікаў яго практычнага прымянення, дасягненні аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, далейшым спрашчэнні парадку падліку і выплаты канкрэтных падаткаў.

Прагаласавалі дэпутаты і за праект Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2023 год», які прайшоў другое чытанне, — такім чынам асноўны фінансавы дакумент краіны на будучы год зацверджаны. Расходы рэспубліканскага бюджэту запланаваны ў аб'ёме 36,5 мільярда рублёў, даходы — у 33,4 мільярда рублёў.

Бюджэтная палітыка ў 2023 годзе будзе накіравана на вырашэнне такіх задач, як забеспячэнне збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў у рамках існуючых даходаў і крыніц фінансавання дэфіцыту бюджэту. Узмацняецца сацыяльная арыентаванасць расходаў, у тым ліку за кошт рэалізацыі мер, накіраваных на павышэнне якасці жыцця насельніцтва, дабрабыт супрацоўнікаў бюджэтнай сферы, падтрымку шматдзетных сем'яў. Бюджэтныя сродкі канцэнтруюцца на кірунках, якія забяспечваюць дасягненне стратэгічных мэт сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, устаноўленых праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку. Аптымізуецца структура дзяржаўнага доўгу, уключаючы частковае выкананне абавязкаў па пагашэнні дзяржаўнага доўгу за кошт падатковых крыніц.

Акрамя іншага, дэпутаты разгледзелі законапраекты, якія датычацца дзяржаўнага прагназавання і праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, сферы дзяржаўнай статыстыкі, пытанняў прававой аховы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці.

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Алена КАЛЯСНЁВА** нагадала, што на сістэмнай аснове праводзіцца работа па барацьбе з экстрэмізмам. Змяненні ў гэтай сувязі закранаюць і заканадаўства па пытаннях прававой аховы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. У прыватнасці, калі на папярэднім этапе той жа заяўкі на таварны знак выяўлена, што выява, якая прапануецца, адносіцца да экстрэмісцкіх, то працэдура рэгістрацыі таварнага знака будзе прыпынена. Гэта датычыцца і геаграфічных указальнікаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На граніцы ЗША і Мексікі абвешчана надзвычайнае становішча з-за мігрантаў



У амерыканскім горадзе Эль-Паса, які знаходзіцца на граніцы з Мексікай, з-за наплыву мігрантаў аб'явілі надзвычайнае становішча. Аб гэтым паведаміла РІА «Навіны». Адзначаецца, што апошнім часам на вуліцах горада істотна павялічылася колькасць мігрантаў. Цяпер іх налічваецца каля 2,5 тысячы чалавек. Чакаецца, што днямі гэтая лічба можа павялічыцца больш чым удвая — да 6 тысяч чалавек. У сувязі з гэтым мэр Эль-Паса Оскар Лісер увёў надзвычайнае становішча. На яго думку, прыцягненне дадатковых рэсурсаў дасць магчымасць у кароткія тэрміны рэагаваць на сітуацыю. Напрыклад, можа спатрэбіцца абсталяваць прытулкі для мігрантаў або прыцягнуць больш праваахоўнікаў для забеспячэння парадку ў горадзе.

### Японія зацвердзіла спіс стратэгічна важных рэсурсаў



Урад Японіі зацвердзіў спіс стратэгічна важных рэсурсаў і матэрыялаў, стабільнасць паставак якіх неабходна забяспечыць нават пры надзвычайнай сітуацыі. Пра гэта гаворыцца ў паведамленні, размешчаным на сайце канцылярыі кабінета міністраў, паведаміла ТАСС. У пералік, у прыватнасці, увайшлі звадкаваны прыродны газ, паўправаднікі, угнаенні, сыравіна для вытворчасці медыцынскіх прэпаратаў і акумулятарныя батарэі. Замацаванне гэтага спіса на заканадаўчым узроўні дазволіць японскім пастаўшчыкам атрымліваць ад улад фінансавую дапамогу з мэтай капітальных укладанняў, правядзення даследаванняў і ўдасканалення тэхналогій вытворчасці. «Гэта вельмі важны крок для ўмацавання ланцужкоў паставак, якія дасць магчымасць нам забяспечыць эканамічную дзейнасць і стабільна атрымліваць неабходныя рэсурсы», — адзначыла на прэс-канферэнцыі міністр эканамічнай бяспекі Санаэ Такаіці.

### У Манрэалі прынята гістарычная дамова па абароне прыроды



На саміце ААН па біяразнастайнасці СОР15 у Манрэалі дасягнута гістарычная дамова, якая стане самым значным намаганнем па абароне кантынентаў і акіянаў, а таксама забяспечыць важнае фінансаванне для захавання біяразнастайнасці ў краінах, якія развіваюцца. Пра гэта паведаміў Euronews. У выніковым дакуменце змяшчаецца абавязацельства абараніць да 2030 года 30 працэнтаў паверхні планеты, якая лічыцца важнай для біяразнастайнасці. Адзначаецца, што пагадненне вызначае экстранныя меры, якія дазволяць прадухіліць імклівую страту многіх відаў флоры і фаўны. «У свеце яшчэ ніколі не было мэты па захаванні прыроды такога маштабу», — адзначыў дырэктар прыродаахоўнай групы Campaign for Nature Браян О'Донэл. Згодна з дакладам Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF), з 1970 года папуляцыі дзікіх жывёл скараціліся ў сярэднім на 69 працэнтаў. У WWF заўважаюць, што гэта вынік дзейнасці чалавека.

Добрая навіна

## УЗРАСЦЕ ЗАРПЛАТА БЮДЖЭТНІКАЎ

**З 1 студзеня 2023 года вырасце заработная плата ў бюджэтных арганізацыях. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.**

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 снежня 2022 года № 887 з 1 студзеня 2023 года базавая стаўка ўстанаўліваецца ў памеры 228 рублёў. У параўнанні з 1 снежня 2022 года (а гэта 212 рублёў), яна вырасце на 7,5 %, а з 1 студзеня 2022 года (207 рублёў) — на 10,1 %.

Паколькі да базавай стаўкі прывязаны іншыя стымулюючыя і кампенсуючыя выплаты, то іх памеры з 1 студзеня 2023 года да вырастуць адпаведна.

Мяркуецца, што павышэнне базавай стаўкі ў 2023 годзе будзе весціся ў некалькі этапаў. Нагадаем, што апошні раз базавую стаўку павышалі 1 лістапада. Усяго яна сёлета павялічвалася шэсць разоў: у студзені — на 9 рублёў, у сакавіку, красавіку, маі, верасні і лістападзе — кожны раз на адзін рубель.

Базавая стаўка з'яўляецца асноўным элементам тарыфнай сістэмы, на аснове якой праводзіцца аплата працы работнікаў бюджэтных і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый.

## Са студзеня вырастуць надбаўкі для медыкаў

**Для далейшага ўдасканалення ўмоў аплаты працы работнікаў аховы здароўя з 1 студзеня для медыкаў адмяняецца базавая даплата, пры гэтым павялічваюцца іншыя стымуляцыйныя выплаты. Пра гэта паведамілі ў Міністэрстве аховы здароўя.**

З улікам падыходаў, адобраных урадам, адпаведнай пастановай адменена базавая даплата. Пры гэтым надбаўка за работу ў сферы аховы здароўя ўрачам-спецыялістам павялічана на 55 працэнтаў, сярэднім медыцынскім работнікам — на 50 працэнтаў.

Акрамя таго, надбаўка за асаблівасці прафесійнай дзейнасці іншым работнікам аховы здароўя (інжынерам, фізікам, хімікам, інструктарам-метадыстам фізічнай рэабілітацыі, фармацэўтычным работнікам і інш.) павялічана на 50 працэнтаў. Таксама ўстаноўлена надбаўка за асаблівасці прафесійнай дзейнасці работнікам бюджэтных арганізацый — ад 60 да 90 працэнтаў базавай стаўкі ў залежнасці ад разраду работы.

Пастанова ўстанаўлівае надбаўку за асаблівасці прафесійнай дзейнасці медыцынскім работнікам, асобам з ліку прафесарска-выкладчыцкага складу, якія з'яўляюцца кіраўнікамі стажыроўкі, — у памеры 5 працэнтаў базавай стаўкі за кожны дзень стажыроўкі. Для правядзення стажыроўкі ўрачоў будуць прыцягвацца высокакваліфікаваныя спецыялісты, якія маюць значныя прафесійныя, практычныя веды і вопыт, у індывідуальным парадку навучаюць новым метадам аказання высокатэхналагічнай медыцынскай дапамогі.

Павялічаны і памер надбаўкі работнікам прафесарска-выкладчыцкага складу за лячэбна-дыягнастычную работу.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ГАЗ, ТОРФ І СВЯТЛО

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Працягваецца будаўніцтва пікава-рэзервовых крыніц з устройствам высокаманеўранага генерыруючага абсталявання сумарнай магутнасцю 800 МВт. У рамках інтэграцыі БелАЭС у энергасістэму краіны гэтыя работы вядуцца на чатырох буйных электрастанцыях: Бярозаўскай і Лукомльскай ДРЭС, Наваполацкай ЦЭЦ і Мінскай ЦЭЦ-5. Першы энергаблок атамнай станцыі з моманту падключэння (у лістападзе 2020-га) выпрацаваў больш за 10,4 млрд кВт·г электраэнергіі і зараз працуе на намінальнай магутнасці, дадаў Віктар Каранкевіч:

— Гатоўнасць другога энергаблока 97 %. У рамках этапных праграм на ім працягваюцца планавыя тэхналагічныя работы, а энергетычны пуск плануецца ў першым квартале 2023 года.

Усе пытанні адносна будаўніцтва ў Беларусі другой АЭС (або трэцяга энергаблока) для павышэння энерганезалежнасці краіны ва ўмовах пастаяннага росту электраспажывання ўвязаныя з задачамі задавальнення магчымасцяў выкарыстання электраэнергіі на энергаёмістых вытворчасцях, на развіццё электратранспарту, на ацяпленне жылля і іншае, падкрэсліў міністр:

— Гэта прадмет далейшай работы, аналізу і магчымых пошукавых работ. Мы будзем і надалей рыхтаваць адпаведныя прапановы, у тым ліку і ў рамках актуалізацыі энергетычнай стратэгіі. Штогод будзе маніторыцца паліўны баланс, аб'ёмы выкарыстання рэсурсаў, іншымі словамі, гэта прадмет пастаяннага аналізу і падрыхтоўкі адпаведных прапаноў на перспектыву.

Міністр заўважыў, што матэрыялы былі падрыхтаваны і ўсебакова разгледжаны органамі дзяржкіравання і НАН пры актыўным удзеле Мінэнерга і Мінэканомікі.

### Рост попыту на электрыфікацыю ў эканоміцы, людзей, дамоў...

Асаблівая ўвага ўдзяляецца электрыфікацыі жылля. Гэтая работа вядзецца па трох асноўных кірунках. Першае: будаўніцтва новых шматкватэрных і індывідуальных жылых дамоў, дзе адразу прадугледжана выкарыстанне электраэнергіі для гарачага водазабеспячэння і ацяплення. Летась і за дзесяць месяцаў сёлета ў краіне збудавана 563 тысячы $м^2$ электрадамоў, а да 2025-га ўзвядуць яшчэ два мільёны.

Другое: перавод шматкватэрнага жылфонду з выкарыстання цвёрдага паліва на электраэнергію. Складзены адпаведныя графікі на пяцігодку, куды ўключана каля сотні дамоў па ўсёй краіне.

Трэцяе: перавод індывідуальнага жылля на электрычнасць для ацяплення і гарачага водазабеспячэння. За студзень—лістапад у энергазабяспечвальныя арганізацыі па выдачу тэхнічных умоў (ТУ) на павелічэнне электрамагутнасці для выкарыстання электраэнергіі на ацяпленне і падагрэў вады сёлета звярнулася 20,9 тысячы ўладальнікаў індывідуальнага жылля. 84 %, або 17,7 тысячы зваротаў, было задаволена. Усяго ж з 2019-га энергетыкі атрымалі 88,6 тысячы падобных запытаў, з якіх задаволена 69,6 тысячы.

— Для задавальнення патрэб насельніцтва і стварэння неабходных тэхнічных умоў пры выкарыстанні электраэнергіі на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне спецыялісты праводзяць як рамонтныя работы, так і мадэрнізацыю электрасетак, найперш у сельскай мясцовасці, — растлумачыў Віктар Каранкевіч. — Павелічэнню попыту выкарыстання электраэнергіі на абазначаныя мэты спрыяюць і стымуляцыйныя меры, у прыватнасці магчымасць кампенсацыі часткі расходаў грамадзян на электрыфікацыю свайго жылля. За апошнія тры гады, згодна з данымі аблвыканкамаў, на гэта было накіравана каля шасці мільёнаў рублёў.

### Торф для шампіньёнаў

Максімальнае ўцягванне ў паліўна-энергетычны баланс краіны мясцовых відаў паліва, у тым ліку торфу, — адна з прыярытэтных задач энергакомплексу краіны. Сёлета тарфяная прамысловасць здабыла 2,4 млн тон торфу, што ў паўтара раза больш, чым летась. А торфабрыкетныя прадпрыемствы пашыраюць сферы дзейнасці, пастаўляючы прадукцыю на патрэбы прамысловасці, цэментных заводаў, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аграпрамысловага комплексу, абазначыў Віктар Каранкевіч:

— Абнаўляецца асартымент тарфяной прадукцыі непаліўнага назначэння. Сёлета, напрыклад, на базе торфабрыкетнага вытворчага ўпраўлення «Беразоўскае» ў Івацэвіцкім раёне запушчаны выраб тарфяных покрыўных матэрыялаў для вырошчвання шампіньёнаў. Гэты новы для тарфянікаў кірунак стане добрай падмогай айчыннаму грыбаводству.

У пошуках новых рынкаў экспарту спецыялісты тарфяной галіны краіны ўжо адгрузілі з завода «Туршоўка» першы чыгуначны састаў з торфам кітайскім спажыўцам. Акрэдытацыю на пастаўкі ў Кітай атрымалі таксама заводы «Глінка» і «Віцебсктарф», дзе ўжо рыхтуюцца партыі торфу. Увогуле, пастаўкі на знешнія рынкі за дзесяць месяцаў сёлета выраслі ў 1,4 раза, дасягнуўшы 218 тысяч тон (больш за 17 млн долараў).

### Газавае пытанне

Важкі ўклад у надзейную работу энергакомплексу краіны ўносіць і газавая галіна, заўважыў міністр энергетыкі:

— Сёлета газазабяспечвальныя арганізацыі правялі комплекснае прыборнае абследаванне 8,9 тысячы кіламетраў падземных газаправодаў і прадыягнаставалі 878 кіламетраў падземных газаправодаў з тэрмінам службы 40 гадоў і больш. Акрамя таго, адрамантавана 425 газаразмеркавальных пунктаў, заменена амаль 150 тысяч адзінак састарэлага бытавога газавага абсталявання, праведзена карэкцыроўка і аптымізацыя 50 схем газазабеспячэння. Прыродным газам сёлета забяспечылі больш за 20 тысяч кватэр і домаўладанняў і ўвялі ў эксплуатацыю каля 800 кіламетраў газаправодаў розных катэгорый.

Работа па ўзгадненні цэнавых умоў з Расіяй на пастаўку газу на 2023 год і далейшым фарміраванні адзінага рынку газу Саюзнай дзяржавы вялася ў рамках саюзнай праграмы, нагадаў Віктар Каранкевіч:

— Беларускі бок своечасова падрыхтаваў адпаведныя прапановы і па цэнах на прыродны газ, і па прынцыпах фарміравання аб'яднанага рынку. Яны неаднаразова абмяркоўваліся на розных узроўнях. Гэта важнае пытанне для абодвух бакоў, якое закранае шмат момантаў, у тым ліку знешніх фактараў.

Да прафесійнага свята, Дня энергетыка, які адзначаецца 22 снежня, айчынныя спецыялісты падышлі са значнымі вынікамі. Нягледзячы на няпростую знешнюю сітуацыю, энергасістэма краіны працуе стабільна, а энергазабяспечвальныя арганізацыі надзейна і ў запатрабаваных аб'ёмах пастаўляюць спажыўцам энергарэсурсы, акрэсліў Віктар Каранкевіч, падзякаваўшы работнікам энергетычнай галіны за атрыманыя вынікі. Міністр павіншаваў усіх з надыходзячым святам, пажадаўшы далейшай надзейнай і безаварыйнай работы, моцнага здароўя і дасягненняў.

**Ірына СІДАРОК.**

19 снежня падчас сустрэчы лідараў Беларусі і Расіі была дасягнута дамоўленасць адносна кошту газу і прынцыпаў фарміравання адзінага газавага рынку. «Мы задаволены вынікамі абмеркавання канцэпцыі адзінага газавага рынку ў цэлым і цэнаўтварэння на найбліжэйшыя тры гады. З'явіліся і новыя тэмы ў галіне паставак газу», — адзначыў **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

— Сфарміраваная камерцыйная цана, пра якую дамовіліся прэзідэнты, зацверджана і базіруецца на беларускай прапанове. Яна выгадная і камфортная для Беларусі, — паведаміў **прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка.** — У найбліжэйшы час будуць падпісаны дамоўленасці на пастаўку прыроднага газу ў Беларусь, і ўпершыню цана зафіксавана адразу на тры гады, каб была стабільнасць і можна было ў макраэканамічных разліках зыходзіць з дакладных лічбаў.

# Не страшны нам ні снег, ні сцюжа

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пастаяць і паразмаўляць часу няма — у зімнюю пару пачынае змяркацца рана, таму, хапаючы дзённыя сонечныя хвіліны, накіроўваемся па маршруце. За якасць уборкі зімой у населеных пунктах Падзвіння адказваюць дзве ўстановы — дарожна-рамонтнае будаўнічае ўпраўленне 144 і жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства Віцебскага раёна. Першыя займаюцца ўборкай снегу на трасах і прыпынках грамадскага транспарту, другія — на вясковых дарогах і вулачках. ЖРЭП абслугоўвае ўсе населеныя пункты раёна, а гэта 727 кіламетраў. Прадпрыемства — навічок на камунальнай арэне, яно існуе ўсяго два гады. На «ўзбраенні» работнікаў зімой знаходзяцца грэйдар, бульдозер «Шантуй», два МАЗы і шэсць трактароў «Беларус» старога і новага пакаленняў. Адпаведна, у асноўным за кожнай адзінкай тэхнікі замацаваны кіроўца. Адсюль і адказ на пытанне, чаму пасля моцных завірух жыхары аддаленых населеных пунктаў не могуць не толькі выехаць на асабістым аўтамабілі, але і дзе-нідзе прайсці пехатой — для аператыўнага рэагавання на падарункі нябеснай канцылярыі не хапае тэхнікі і работнікаў.

А мы між тым упарта калясім па андронавіцкіх вуліцах — завітаць трэба на кожную. Апусціўшы адвал ці па-народнаму коўш на зямлю, кіроўца праязджае па завулку да канца, здае «задам» і яшчэ раз праходзіцца па снежным покрыве.



Дарэчы, па маіх назіраннях, адным з галоўных крытэрыяў для кіроўцаў на ўборачнай тэхніцы з'яўляецца ўменне віртуозна ездзіць заднім ходам — не заўсёды хапае месца развярнуцца, асабліва — для МАЗа з прычэпам. Дзяніс расказвае, што альгоўскі напрамак — Андронавічы, Альгова, Падбярэззе, Бабінічы — неафіцыйна замацаваны за ім. Нягледзячы на тое, што для Уласенкі гэта першая зіма ў ролі байца «снежнага дэсанта», ён з сярэдзіны лістапада ўжо добра вывучыў вясковыя дарогі: ведае, дзе пад снегам хаваецца канава, а дзе высокая верагоднасць затрымацца. Апошняе, як бы жартоўна ні гучала, таксама здараецца з работнікамі камунальных службаў, тады на дапамогу прыходзяць мясцовыя ўлады, накіроўваючы трактары з мэтай «выцягнуць» калег.

Расчыстка вуліц у гэтай вёсцы заняла каля гадзіны, але такі прыём працуе толькі ў малых населеных пунктах з некалькімі вуліцамі. Пасля Андронавіч на чарзе вялікае Альгова каля горада, у якім і дзіцячы садок, і Дом культуры, і школа, і вытворчы кааператыў. Па вёсцы мы калясілі дзве з паловай гадзіны! Я ўжо збілася з падліку, колькі кругоў мы зрабілі, імкнучыся ўбраць снег з кожнай вуліцы, але Дзяніс ведае дакладна, куды яшчэ трэба заехаць. Дзе з-пад снегу паказваецца лёд — адразу падсыпае сумессю пяску і солі, а вось ссыпаць утрамбаваныя снежныя каляіны вуліц непажадана — дарога раскісне і ператворыцца ў кашу. Каля школы заўважылі гаспадара аўтамабіля, які актыўна махаў МАЗу... лапатай. І гэта было не пагрозай, а просьбай узяць з прычэпа крыху пяску, каб мець магчымасць выехаць з паркоўкі. «Такі выпадак — не адзіны, — усміхаецца Дзяніс Уласенка. — Заўсёды іду насустрач людзям, а калі трэба, то і дапамагаю выпхнуць аўтамабіль. Бывае, што ў вёсках жыхары звяртаюцца з просьбамі расчысціць пад'езд у двор, пляцоўку для аўталаўкі — усё раблю. У населеных пунктах, за якія адказваю я, мой сіне-аранжавы «МАЗік» ужо ведаюць і чакаюць, а некаторыя нават падрыхтоўваюць месца для развароту. Стараемся працаваць не дзеля «птушачкі», а дзеля людзей».

Афіцыйна ў кіроўцаў рабочы дзень доўжыцца з васьмі гадзін раніцы да пяці вечара з перапынкам на абед у кабіне. На справе ж падчас моцнага снегападу снежныя экіпажы выходзяць у раён няспынна, у суботу і нядзелю таксама. Чысціць вуліцы ў вячэрнія прыцемкі — справа небяспечная: можна не толькі моцна «засесці» ў снезе, але і пашкодзіць адвал, таму лепш выходзіць на змену са світання. У сярэднім за дзень тэхніка праязджае каля 150 кіламетраў, у некаторых асабліва цяжкіх вёсках — звыш 200. МАЗы, як правіла, працуюць у населеных пунктах, дзе ёсць асфальт або вуліцы з друзавым пакрыццём, грэйдар і трактары — на складаных участках.

«За дзень у дыспетчарскую службу паступае шмат зваротаў ад грамадзян, на якія мы па магчымасці аператыўна рэагуем. Добра, што на дапамогу прыходзяць нашы мясцовыя прадпрыемствы, за што ім шчыры дзякуй. Так работнікі Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі расчышчаюць вуліцы Запольская і Курынская сельсаветаў, Віцебскі лясгас працаваць у раёне на сваім грэйдары. Усе ўсведамляем, што робім адну агульную справу», — расказаў **дырэктар ДУ «ЖРЭП Віцебскага раёна» Станіслаў ЗАВАДСКІ.**

Пакуль едзем па альгоўскіх вулачках, разважаю, што было б здорава замяніць адвалы на аўтаматызаваныя каўшы: кіраваць адвалам з кабіны можна толькі па схеме «падняць-апусціць», а каб павярнуць яго налева або направа, неабходна выйсці з цёплай кабіны і зрабіць гэта ўручную. Кіраванне кнопкамі на панэлі значна спрасціла б і паскорыла рабочы працэс, а гэта значыць, што за дзень замест пяці-шасці вёсак можна было б пачысціць каля васьмі. Пакуль з каўшамі, якія спраўляюцца са снежным настам больш эфектыўна, толькі «Шантуй» і МТЗ-92П, але прадпрыемству ёсць куды імкнуцца.

Для мяне гэты дзень выдаўся яркім і прыемным: па-за лабавым шклом адкрываюцца маляўнічыя падзвінскія прасторы — адно замілаванне. У гэтым мяне падтрымаў і кіроўца Дзяніс, і дадаў, што работа на МАЗе летам і зімой значна адрозніваецца, патрабуе ад работніка асаблівых якасцяў. Улетку — гэта адказнасць, узімку таксама яна ў сінтэзе з рашучасцю, бо не кожны асмеліцца віраваць па непраязных вясковых дарогах і часам праціскацца на абмежаваных плошчах. На маё пытанне, у чым заключаецца яго прафесіянальны сакрэт, Дзяніс Уласенка адказаў проста: рабіць усё сумленна.

***Аляксандра ГВОЗДЗЕВА,***
***фота аўтара.***

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя

№ 9 (72)

Міжнародныя адносіны

# Ці магчыма ахова прыроды без дыялогу?

## Палітызацыя ўсіх пытанняў міждзяржаўнага супрацоўніцтва закранула і ахову навакольнага асяроддзя



**Рэспубліка Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай 22 міжнародных дагавораў, якія рэгулююць супрацоўніцтва дзяржаў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў і змякчэння наступстваў змены клімату. Але апошнім часам наша краіна сутыкаецца з пэўнымі складанасцямі дыялогу на міжнародных пляцоўках. Чаму так адбываецца, расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва Мінпрыроды Ларыса ЛУКІНА.**

— Наша дзяржава заўсёды добрасумленна і ў поўнай меры выконвае ўсе ўзятыя на сябе міжнародныя абавязацельствы, — падкрэслівае Ларыса Лукіна. — Гэта значыць, што Беларусь удасканальвае сваё прыродаахоўнае заканадаўства і ўносіць змены ў дзейнасць сваіх органаў дзяржкіравання, бізнес-колаў, акадэмічнай супольнасці і іншых зацікаўленых. Усё гэта патрабуе вялікай работы з боку дзяржавы.

Удзел нашай краіны ў рабоце міжнародных пляцовак ставіць за мэту наступнае: па-першае, беларускія прадстаўнікі прасоўваюць і абараняюць нацыянальныя інтарэсы, а, па-другое, бяруць удзел у фарміраванні правілаў на міжнароднай арэне ў галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Актыўны ўдзел у рабоце міжнародных арганізацый і органах міжнародных дагавораў садзейнічае таму, што Беларусь з'яўляецца адной з дзяржаў — заканадаўцаў у фарміраванні трэндаў і тэндэнцый развіцця міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў прыродаахоўнай сферы.

Разам з тым, паводле слоў прадстаўніцы Мінпрыроды, апошнія два гады Беларусь сутыкнулася з беспрэцэдэнтнай палітызацыяй усіх пытанняў міждзяржаўнага супрацоўніцтва, у тым ліку ў галіне аховы навакольнага асяроддзя. З-за ўвядзення аднабаковых абмежавальных мер, спроб выключэння дзяржавы з работы органаў міжнародных дагавораў парушаецца ўніверсальны характар міжнароднага супрацоўніцтва, вырашэнне экалагічных пытанняў сыходзіць на другі план. Выключэнне любой дзяржавы з міждзяржаўнага супрацоўніцтва прыводзіць да зніжэння эфектыўнасці намаганняў, якія прадпрымаюцца. Пытанні аховы навакольнага асяроддзя практычна заўсёды носяць трансгранічны характар, а экасістэмы залежаць адна ад адной. І дзяржаве ці групе краін з абмежаваным удзелам комплексна і эфектыўна рашыць такія праблемы немагчыма.

— Цяпер пытанні аховы навакольнага асяроддзя выкарыстоўваюцца як інструмент ціску і ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы, — кажа Ларыса Лукіна. — Яркім прыкладам гэтаму служыць апошняе пасяджэнне органаў і нарады бакоў Орхускай канвенцыі, калі Рэспубліку Беларусь абвінавацілі ў парушэнні палажэнняў міжнароднага дагавора. Пры гэтым аргументы і доказы беларускага боку не прымаліся да ўвагі. Больш за тое, падчас нарады дзяржаў — удзельніц Орхускай канвенцыі калектыўным Захадам была зроблена спроба ўмяшацца ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы, што катэгарычна забаронена нормамі міжнароднага права, і прымусіць Беларусь змяніць сваю ўнутраную палітыку, каб дагадзіць калектыўнаму Захаду. Зразумела, Беларусь не магла дапусціць такога развіцця сітуацыі і прыняла рашэнне выйсці з Орхускай канвенцыі.

Яшчэ адным абуральным прыкладам палітызацыі экалагічнага парадку спецыяліст называе адсутнасць адэкватнай рэакцыі міжнародных арганізацый і органаў міжнародных дагавораў на сітуацыю, выкліканую ўзвядзеннем загараджальнага збудавання Рэспублікай Польшча ўздоўж беларуска-польскай мяжы, у тым ліку на тэрыторыі аб'екта Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА «Белавежская пушча».

Прадстаўнікі краіны на пляцоўках ЮНЕСКА, ЮНЕП, Савета Еўропы, Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН у ходзе пасяджэнняў органаў міжнародных дагавораў звярталі ўвагу на ўсе неспрыяльныя наступствы, з якімі сутыкаецца Белавежская пушча з-за разрыву адзінага трансгранічнага прыроднага аб'екта, а таксама на стан яе экалагічных сістэм, які выклікае хваляванне спецыялістаў.

— Неаднаразова беларускія прадстаўнікі запрашалі міжнародныя экспертныя місіі наведаць Белавежскую пушчу і сваімі вачыма ацаніць тую сітуацыю, якая была створана неабдуманымі палітызаванымі дзеяннямі польскага боку, — падкрэслівае прадстаўніца прыродаахоўнага ведамства. — Аднак зразумелага адказу мы не атрымалі. Вымушаны канстатаваць, што цяпер мы назіраем сапраўдны крызіс міжнародных намаганняў у галіне аховы навакольнага асяроддзя ў сувязі з палітызацыяй гэтай сферы міждзяржаўных адносін. І ён не можа быць вырашаны самавольным выключэннем асобных дзяржаў з міжнароднага дыялогу.

**Таццяна ІВАНОЎСКАЯ.**

На сінаптычным фронце

# ПРАГНОЗ НАДВОР'Я ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ, ЛЁТЧЫКАЎ, АГРАРЫЯЎ...

## Спецыялісты расказалі пра гідраметэаралагічнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі

**Вынікі праграмы аб развіцці сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы (СД) ва ўмовах змены клімату на 2017—2021 гады і падрыхтоўка праграмы на 2023—2027 гады. Распрацоўка далейшай нарматыўна-прававой і метадалагічнай баз і ўдасканаленне механізму двухбаковага абмену метэаралагічнай інфармацыяй. Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі эксперты ў Магілёве на 74-й сумеснай калегіі Камітэта Саюзнай дзяржавы па гідраметэаралогіі і маніторынгу забруджвання навакольнага асяроддзя.**

### Ва ўмовах санкцый

Летась Мінпрыроды Беларусі сумесна з Расгідраметам завяршылі праграму Саюзнай дзяржавы аб развіцці сістэмы гідраметэаралагічнай бяспекі Саюзнай дзяржавы ва ўмовах змены клімату на 2017—2021 гады. Укараненне яе вынікаў у розных сферах жыццезабеспячэння насельніцтва і канкрэтных галінах эканомікі абедзвюх дзяржаў садзейнічае змяншэнню шкоды ад неспрыяльных умоў надвор'я і сацыяльна-эканамічных наступстваў, якія выкліканы зменай клімату, а таксама дазваляе ў цэлым значна павысіць якасць метэаралагічнага абслугоўвання ў нашых краінах, зазначыў **Іван ПРЫХОДЗЬКА, намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі:**

— Асаблівую значнасць у сённяшніх умовах набывае далейшае павышэнне эфектыўнасці работы гідраметэаралагічных служб. Для забеспячэння гідраметэаралагічнай бяспекі СД ва ўмовах змены клімату ў нас з вамі шмат агульных пытанняў, якія больш вынікова можна вырашыць сумеснымі намаганнямі. Санкцыйная палітыка калектыўнага Захаду і ЗША не толькі ўплывае на наша эканамічнае развіццё, але і негатыўна адбіваецца на міжнародным супрацоўніцтве ў галіне метэаралогіі, у тым ліку на ўзаемадзеянні з Сусветнай метэаралагічнай арганізацыяй і адпаведнымі еўрапейскімі інстытутамі і арганізацыямі. Па сутнасці, мы знаходзімся ў новай рэальнасці, якую неабходна трансфармаваць у сумесную работу. Адпаведна, нашы задачы павінны быць больш амбіцыйнымі, а іх рэалізацыя — больш аператыўнай.

У лютым 2022-га Белгідрамет адключылі ад інфармацыі, якую арганізацыя атрымлівала ад Еўрапейскага цэнтра сярэднетэрміновых прагнозаў без тлумачэнняў. Перастала існаваць як такое ўзаемадзеянне з прыгранічнымі гідраметэаслужбамі Латвіі, Літвы, Польшчы, Украіны, таму беларусы сталі шукаць магчымасць працаваць без іх, падзялілася **Тамара ГОМАНАВА, начальнік Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя:**

— У многім дапамагаюць калегі з Расіі — у частцы і прагранмнага забеспячэння (сумесныя распрацоўкі краін), і выкарыстання абсталявання, а таксама методык, сінаптычнага разліку. Сёння спраўджвальнасць нашых сярэднесутачных прагнозаў складае 98 %, а на трое сутак — 95 %, так што, можна сказаць, што мы сталі мацнейшыя.



### Узаемнае павышэнне якасці і навуковага патэнцыялу

Навуковыя даследаванні, якія праводзяцца гідраметэаралагічнымі службамі Беларусі і Расіі, у тым ліку ў рамках праграмы СД, садзейнічаюць нарошчванню навуковага патэнцыялу і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Шчыльнае ўзаемадзеянне ў рамках саюзнай праграмы, асабліва на прыгранічных тэрыторыях, адбываецца паміж службамі краін ужо не адно дзесяцігоддзе і дазваляе лёгка вырашаць прафесіянальныя гідраметэаралагічныя пытанні, перакананы **Ігар ШУМАКОЎ, кіраўнік Расгідрамета:**

— Прагнозы, якія вы бачыце, немагчыма зрабіць у адной дзяржаве, не ведаючы, што робіцца ў суседняй. Вялікі блок сумеснай работы датычыцца таксама маніторынгу забруджвання навакольнага асяроддзя і сумеснага забеспячэння палётаў грамадзянскай авіяцыі. Ніводны пілот не ўзлятае без прагнозу надвор'я. У новых геапалітычных умовах былі праблемы з забеспячэннем грамадзянскай авіяцыі прагнозамі, аднак сумесна з беларускімі калегамі мы іх хутка вырашылі, так што ніхто гэтага, бадай, і не заўважыў.

— Кліматычныя змены маюць прагрэсуючы характар, што негатыўна адбіваецца на ўсіх сферах жыццядзейнасці: эканоміцы, сельскай гаспадарцы, здароўі чалавека. Таму раннія прагнозы кліматычных змен — архіважныя, — дадаў **Мікалай ВАСІЛЬКОЎ, старшыня камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і ліквідацыі наступстваў аварый.**

Пытанні, вынесеныя на абмеркаванне саюзнай калегіі, у асноўным датычыліся паглыблення супрацоўніцтва паміж краінамі. У новай праграме прынцыпы застаюцца ранейшымі, аднак будуць распрацаваны новыя тэхналогіі прагназіравання, каб прагнозы сталі больш дакладнымі, а інфармацыя лягчэй даходзіла да спажыўца. Працягнецца і трансгранічнае супрацоўніцтва паміж краінамі. Сярод прыгранічных падраздзяленняў нават аб'яўлены адпаведны прафесійны конкурс. У Беларусі, дарэчы, вельмі моцныя спецыялісты ў галіне аграметэаралогіі, дадаў кіраўнік Расгідрамета:

— Гідралогія таксама вельмі важная тэма, асабліва падчас вясенняй ці летняй паводкі, таму разам з кліматычнымі пытаннямі яна ўвойдзе ў новую саюзную праграму.

Гідраметэаслужба не толькі вядзе назіранне, але і забяспечвае органы выканаўчай улады і насельніцтва неабходнай інфармацыяй, якая дапамагае аператыўна прымаць кіруючыя рашэнні, нагадала **Святлана ТРАФІМАВА, міністр прыродных рэсурсаў і экалогіі Іркуцкай вобласці:**

— Урад Іркуцкай вобласці з 2016 года працуе з Беларуссю ў рамках пагаднення аб гандлёва-эканамічным, навуковым і культурным супрацоўніцтве. У рамках рэалізацыі федэральнага праекта «Чыстае паветра для горада Брацка» беларуская кампанія паставіла тралейбусы.

У Беларусі за апошнія тры гады была сур'ёзна мадэрнізавана гідраметэаслужба, таму, нягледзячы на знешнія абмежаванні, яна мае даволі высокі ўзровень якасці паслуг, абазначыў Іван Прыходзька:

— Сумесная работа гідраметэаслужб Беларусі і Расіі — добры прыклад эфектыўнай інтэграцыйнай пляцоўкі для ўзаемадзеяння і ўзаемаразвіцця. Рэалізавана ўжо пяць саюзных праграм у галіне метэаралогіі, і іх вынікі ўкараніліся ў вытворчай практыцы службаў краін.

Эксперты галіны прынялі рашэнні па ўсіх дзевяці разгледжаных на калегіі пытаннях практычна аднагалосна. Яны тлумачаць гэта зацікаўленасцю ў неабходнасці далейшай інтэграцыі і ўдасканалення гідраметэаслужбаў абедзвюх краін.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Побач з намі

# ДЫХАЙ, РЫБА!

## Як выратаваць падводных насельнікаў ад гібелі пад тоўшчай лёду?

**Снежная і марозная зіма, якая ўжо больш за месяц гаспадарыць у Беларусі, стварае складанасці не толькі для людзей і транспарту, але і можа нашкодзіць дзікай фаўне. І, нягледзячы на адносны спакой, які ўстанавіўся з надыходам халадоў на вадаёмах, пад тоўшчай лёду можа разыграцца сапраўдная трагедыя. Калі мы не дапаможам яе прадухіліць...**

Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя абвясціла важную экалагічную акцыю «Створым лункі — выратуем рыбу ад замору!» Прыродаахоўнае ведамства заклікае рыбакоў і іншых неабыякавых да прыроды грамадзян ствараць на вадаёмах краіны лункі ці іншыя прыстасаванні, якія дапамогуць насыціць ваду кіслародам і прадухіліць гібель рыбы і яе маладняку.

### Чаму і як узнікаюць заморы?

Заморы — гэта масавая гібель рыб у выніку змяншэння растворанага ў вадзе кіслароду (да 5—30 % нармальнага насычэння, ці менш за 4 мг/дм³). Пры гэтым яны могуць адбывацца як зімой, так і летам. У халодны перыяд года небяспека замораў павышаецца звычайна ў лютым-сакавіку, што звязана са складанымі працэсамі паступлення кіслароду з паветра, а таксама раскладаннем арганічнай біямасы (заа-, біяпланктону, расліннасці). Але чым раней пачаць прафілактычныя мерапрыемствы, тым лепш будзе адчуваць сябе рыба.

Часцей за ўсё такія з'явы назіраюцца на мелкаводных бяссцёкавых ці слабапраточных азёрах з высокім утрыманнем арганічных рэчываў. Сустракаюцца заморы і на рэках, асабліва малых, падчас летне-асенніх паводак. Але калі летам вада таксама ўзбагачаецца кіслародам за кошт ветру, дажджу, канвекцыйных працэсаў, а таксама дзякуючы фотасінтэзу водных раслін, то зімой усё гэта амаль немагчыма. Ускладняе сітуацыю вялікая таўшчыня лёду, што блакіруе доступ атмасфернага паветра і кіслароду, працяглае паніжэнне тэмпературы паветра да -15 °С і ніжэй, стабільнае снежнае покрыва.



Стварэнне палонак — адзін з самых эфектыўных спосабаў прадухілення замораў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Кісларод — пад кантролем спецыялістаў

Як вызначыць, што на вадаёме пачаўся замор? Прадвеснікі працэсу — жукі-плывунцы і іншыя насякомыя, якія збіраюцца ў лунках. Акрамя таго, можа паказвацца дробная рыба. Яна больш рухавая, чым дарослыя асобіны, таму ёй патрабуецца больш кіслароду. Спецыялісты ж вызначаюць заморныя з'явы падчас даследаванняў проб вады на ўтрыманне растворанага кіслароду.

Станам водных аб'ектаў займаюцца прадстаўнікі лабараторый Рэспубліканскага цэнтра аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Штогод з 1 студзеня па 1 красавіка яны з пэўнай перыядычнасцю назіраюць за азёрамі і рэкамі краіны.

— За 2022 год лабараторная служба РЦАК абследавала больш за 200 водных аб'ектаў, схільных да заморных з'яў, — расказала **намеснік начальніка цэнтра Святлана КАСЦЯН**. — У зімовы перыяд спецыялісты зафіксавалі нізкае ўтрыманне кіслароду на 16 такіх аб'ектах, у 2021-м — на 28.

Гэты паказчык вызначаецца экспрэс-метадам непасрэдна на возеры ці рацэ — вынікі вымярэнняў вядомыя ўжо праз некалькі хвілін. Калі ўзровень кіслароду нізкі, спецыялісты РЦАК праводзяць дадатковыя даследаванні вады па 14 паказчыках (амоній-іон, нітрат-іон, фосфар агульны, жалеза агульнае і іншыя). Усе гэтыя звесткі потым перадаюцца ў тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды, каб прыняць меры і прадухіліць заморныя з'явы.

### Хто дапаможа?

Большасць вадаёмаў і вадацёкаў краіны ўваходзяць у лік так званых рыбалоўных угоддзяў, дзе дазволена лоўля рыбы. Частка з іх арандуецца для вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і перададзена ў бязвыплатнае карыстанне. Астатнія ўваходзяць у фонд запасу.

Рыбалоўныя ўгоддзі з фонду запасу павінны ахоўваць мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ці спецыяльна ўпаўнаважаныя юрыдычныя асобы. За кошт мясцовых бюджэтаў праводзяцца мерапрыемствы па прадухіленні заморных з'яў і ліквідацыя іх наступстваў. Такая ж задача стаіць і перад арандатарамі рыбалоўных угоддзяў.

**Таму, калі вы выявілі заморную з'яву, праінфармуйце пра гэта:**

— *у арандаваных ці перададзеных у бязвыплатнае карыстанне рыбалоўных угоддзях* — арандатараў і карыстальнікаў, а таксама Дзяржаўную інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь;

— *у рыбалоўных угоддзях фонду запасу* — мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, Дзяржінспекцыю, Мінпрыроды і яго тэрытарыяльныя органы.

Але ў прыродаахоўным ведамстве ўпэўнены — акрамя адказных арганізацый, у справе выратавання беларускай іхтыяфаўны таксама не абысціся без падтрымкі грамадзян — мясцовага насельніцтва, моладзі, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і іншых неабыякавых да стану наваколля людзей.

### Што можна зрабіць?

**Спецыялісты выдзяляюць некалькі найбольш эфектыўных мер папярэджання замораў:**

✓ ***Унясенне вапны ў вадаёмы***

Вапнаванне садзейнічае раскладанню і паскарэнню мінералізацыі арганічнага рэчыва, а таксама паляпшэнню газавага рэжыму, нейтралізуе кіслую рэакцыю вады. Нягашаную вапну ўносяць у вадаём з разліку 1-2 ц/га. Пры выкарыстанні гашанай вапны ці молатага вапняку нормы ўнясення павялічваюцца, адпаведна, у 1,3 і 1,8 раза.

✓ ***Аэрацыя вадаёмаў***

Аэрацыя — гэта працэс, пры якім паветра цесна кантактуе з вадой шляхам распылення вады ў паветры ці калі бурбалкі паветра прапускаюць праз ваду. Разам з тым аэрацыю могуць праводзіць і праз гідрамеханічнае перамешванне воднай тоўшчы.

✓ ***Стварэнне палонак на вадаёмах***

Колькасць палонак залежыць ад плошчы вадаёму і ў сярэднім складае 3-5 шт./га. Палонкі трэба размяшчаць у цэнтры вадаёма і па яго перыметры, дзе глыбіня слою, які не прамярзае, складае 50-60 см. Для прадухілення замярзання палонак неабходна ў іх устанавіць снапы з чароту, рагозу і іншых пустасцволых «дыхаючых» раслін ці падвешваць мяшкі з соллю ў такіх палонках з разліку 5 кг/мяшок. Можна выкарыстоўваць тэхнічную соль, якую прымяняюць для ачысткі катлоў у кацельнях.

**Настасся АЛЯКСЕЕВА.**

### Цікава ведаць!

Кожны від рыбы па-рознаму рэагуе на змяншэнне растворанага ў вадзе кіслароду. Па гэтым паказчыку вучоныя падзялілі прэснаводных рыб на чатыры групы.

— У групу з вузкай адаптацыйнай здольнасцю ўваходзяць фарэль, сіговыя і іншыя віды, якія патрабуюць высокага ўтрымання кіслароду (не менш за 7 мг/дм³), а ўзровень у 5 мг/дм³ для іх ужо крытычны.

— Далей ідуць харыус, сцерлядзь, галавень, марона, рыбец, мянтуз, судак і іншыя дробныя рыбы, часцей за ўсё прадстаўнікі рэк. Ім патрабуецца 5-7,5 мг/дм³ растворанага кіслароду.

— Да трэцяй групы адносяцца рыбы, фізіялагічныя функцыі якіх не прыгнятаюцца пры ўтрыманні кіслароду да 4 мг/дм³. Сярод іх большасць азёрна-рачных жыхароў — шчупак, плотка, язь, гусцяра, лешч, акунь, ёрш і іншыя.

— Самыя ж малаўразлівыя віды, здольныя пераносіць паніжэнне ўтрымання кіслароду да 0,5-5 мг/дм³, — карп, лінь, карась.

У беларускай іхтыяфаўне ёсць і свае ўнікумы — вугор і ўюн. Ім недахоп кіслароду ў вадзе амаль не страшны. Першы від валодае здольнасцю падскурнага дыхання, а другі можа засвойваць кісларод з паветра, глытаючы яго ў кішэчнік.

# Урадлівая глеба для багатага хлеба

## Што робіцца ў Беларусі для захоўвання сельскагаспадарчых зямель

**Глеба — нацыянальны набытак любой краіны, ад захоўвання і рацыянальнага выкарыстання якога залежыць харчовая бяспека і ўстойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё ўсёй дзяржавы, лічаць эксперты. І яны маюць рацыю, паколькі зямельны рэсурс — гэткі ж вычарпальны, як і карысныя выкапні ў ім. Збяднелая і пустая глеба не зможа дапамагчы чалавецтву, таму чалавек мусіць дапамагчы ёй сам.**

### УВАГА — ЗДАРОЎЮ І ЭКАРЭАБІЛІТАЦЫІ ГЛЕБЫ

Стратэгіяй Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем, разлічанай да 2030 года, да якой Беларусь далучылася летась, вызначана задача прадухілення дэградацыі зямель і іх аднаўлення. Гэты дакумент выконваецца праз мерапрыемствы, вызначаныя нацыянальнымі планамі дзеянняў па прадухіленні дэградацыі зямель на пяцігодкі, расказала **Людміла БАРТАШЭВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды:**

— Першы такі план дзеянняў быў рэалізаваны ў 2016—2021 гадах. Для далейшай рэалізацыі стратэгіі Канвенцыі ААН летась урад Беларусі зацвердзіў нацыянальны план дзеянняў на 2021—2025 гады. Адпаведна з планам, выконваецца шэраг практычных мерапрыемстваў па аднаўленні дэградзіраваных зямель. Гэта, у прыватнасці, экарэабілітацыя парушаных тарфянікаў, рэкультывацыя ўнутрыгаспадарчых кар'ераў, лесааднаўленне на гарах, лесаразвядзенне на пясках, у ярах і на схілах і іншыя.

Экарэабілітацыя парушаных тарфянікаў праводзіцца ў асноўным на выпрацаваных плошчах тарфяных радовішчаў і балот з парушаным гідралагічным рэжымам. Напрыклад, у Талачынскім раёне рэкультываваныя тарфяныя плошчы радовішча Усвіж Бук на плошчы больш як 53 гектары, а землі вернутыя былому ўладальніку (лясгасу) пад паўторнае забалочванне і натуральнае лесааднаўленне. Напрыканцы 2020-га было забалочана звыш чатырох тысяч гектараў дэградзіраваных асушаных тарфянікаў на Гомельшчыне.

### МІКРАЎГНАЕННІ — ДЛЯ ЯКАСЦІ, МЕЛІЯРАЦЫЯ — ДЛЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ПРЫДАТНАСЦІ

Для вырашэння праблем урадлівасці глебы і абароны яе ад дэградацыі ў Беларусі створана нарматыўная база, а стан глебы пастаянна маніторыцца. З 1970 года праводзіцца буйнамаштабнае аграхімічнае даследаванне глеб сельскагаспадарчых зямель, а інфармацыя пра гэта назапашваецца ў банку даных на розных узроўнях: участак, поле, гаспадарка, раён, вобласць, краіна, заўважыў **Васіль ЯДЛОЎСКІ, начальнік упраўлення расліннаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі:**

— На 2021—2025 гады зацверджана праграма мерапрыемстваў па захаванні і павышэнні ўрадлівасці глеб краіны. Да іх адносяцца, у прыватнасці, сістэма мер па аптымізацыі кіслотнасці глеб і павышэнні запасаў арганічнага рэчыва ў ворных землях. Праграмай ацэнены баланс азоту, фосфару, калію, серы з вызначэннем патрэбы глебы ў мінеральных угнаеннях да 2025 года. А таксама прыведзена сістэма выкарыстання мікраўгнаенняў у тэхналогіях вырошчвання сельскагаспадарчых культур.

Рэкамендацыі рэгламентуюць парадак вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці на забруджаных радыенуклідамі землях і з'яўляюцца метадычнай асновай для выпрабу прадуктаў харчавання з утрыманнем радыенуклідаў у дапушчальных мерах.

Найбольш важны паказчык глебы — бал яе ўрадлівасці, дзякуючы якому можна ацаніць вытворчы патэнцыял зямельных рэсурсаў. Сельскагаспадарчыя землі агулам маюць бал 29, а ралля ў Беларусі ацэньваецца ў сярэднім у 32 балы. Крытэрый для ацэнкі ўрадлівасці глебы — наяўнасць у ёй гумусу, фосфару і калію, а таксама кіслотнасць. Таму важна павышаць запасы гумусу ў глебе для яе ўрадлівасці, падкрэсліў спецыяліст.

Паняцці «ўрадлівасць глеб» і «меліярацыя» для Беларусі непарыўна звязаныя, бо першапачаткова ў краіне было забалочана і пераўвільготнена каля 40 % тэрыторыі, іншымі словамі, 8 млн гектараў былі непрыдатныя не толькі для сельскай гаспадаркі, але і фактычна для пражывання, паведаміў **Аляксандр АЖАНКОЎ, дырэктар Інстытута меліярацыі.**

— Меліярацыйны комплекс, які дастаўся Беларусі з савецкіх часоў (2,8 млн меліяраваных сельскагаспадарчых зямель), — не проста лічба (35 % ад усіх сельскагаспадарчых зямель), але і гарантыя харчовай бяспекі пры амаль любых кліматычных анамаліях. А яшчэ гэта базіс мяса-малочнага экспарту, бо менавіта на гэтых землях вырабляецца да 60 % усіх зялёных кармоў, — заўважыў спецыяліст.

У краіне дзейнічае амаль пяць тысяч меліярацыйных сістэм. Няма ніводнага раёна, дзе не было б меліяраваных зямель, а ў некаторых — гэта палова плошчы. А адны з самых урадлівых глеб краіны — тарфянікі — да меліярацыі былі проста багнай. Праз асушэнне балот не толькі паляпшаўся сацыяльна-эканамічны і лагістычны стан рэгіёнаў, але і павысілася прадукцыйнасць зямель.

**Ірына СІДАРОК.**

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

**Эпідэміёлагі заяўляюць сёлета пра надзвычай ранні прыход вірусаў грыпу — яго выпадкі рэгіструюцца ўжо некалькі тыдняў, у той час як звычайна яго чакалі ў канцы студзеня — пачатку лютага. Усё часцей даводзіцца чуць пра вяртанне «свінога» грыпу. Але ці такі ён страшны, як мы гэта ўяўляем? І ці варта чакаць новых штамаў каранавіруса? Медыкі расказалі, якім чакаецца сёлетні сезон рэспіраторных хвароб.**

# ЗІМА. СЕЗОН ПРАСТУД. ЯКІМ ЁН БУДЗЕ СЁЛЕТА?

## Захваральнасць на рэспіраторныя інфекцыі расце, у тым ліку на «свіны» грып

### ВЯРНУЛІСЯ РАНЕЙ, ЧЫМ ЧАКАЛІ

Як вядома, нам пагражае вялікая колькасць вірусаў, у тым ліку 200 з іх здольныя выклікаць рэспіраторныя захворванні. Гэта і класічныя, добра вядомыя нашаму імунітэту вірусы (грыпу, парагрыпу, адэнавірусы, рэспіраторна-сінцытыяльны вірус), так і новыя (каранавірус SARS-COV-2).

Найбольшую небяспеку тояць вірусы грыпу, бо выклікаюць эпідэмічныя пад'ёмы захваральнасці. З нядаўняга часу да ліку такіх жа небяспечных узбуджальнікаў далучыўся і SARS-COV-2, які выклікаў пандэмію COVID-19.

Сярод вірусаў грыпу эпідэмічную значнасць маюць вірусы тыпу А (гэта H1N1 і H3N2) і вірус тыпу В (улучаюць дзве яго генетычныя лініі: «Вікторыя» і «Ямагата»). Яны адначасова цыркулююць у чалавечай папуляцыі: у некаторых краінах эпідэмічны пад'ём захваральнасці выклікаюць адны вірусы грыпу, у іншых — іншыя.

Традыцыйны пад'ём захваральнасці на грып назіраецца ў студзені — лютым, але сёлета вірусы грыпу з'явіліся раней. І гэтаму некалькі тлумачэнняў.

— З'яўленне віруса SARS-COV-2 і развіццё пандэміі COVID-19 прывяло да таго, што іншыя рэспіраторныя вірусы былі выціснуты са звычайнай сезоннай цыркуляцыі. У сезоне 2020/2021 гадоў мы амаль не рэгістравалі вірусаў грыпу ў глабальным маштабе, — кажа **загадчык лабараторыі грыпу і грыпападобных захворванняў РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА.** — У сезоне 2021/2022 гадоў яны вярнуліся. І ў краінах Паўночнага паўшар'я рэгістраваўся хвалепадобны пад'ём захваральнасці: першая хваля прыходзілася на асенні перыяд, у нас таксама назіраўся некаторы пад'ём захваральнасці, выкліканы штамам H3N2. Аднак распаўсюджанне каранавіруса варыянта «амікрон» прывяло да таго, што грып хутка сышоў на нішто. Сёлета мы таксама прагназуем больш ранні эпідэмічны пад'ём захваральнасці, што і назіраем.

У краінах Еўропы эпідэмія грыпу пачалася з пачатку лістапада.

— У многіх краінах ужо перавышаны эпідэмічныя парогі як па захваральнасці, так і па частаце выяўлення. У глабальным маштабе дамінуюць вірусы грыпу H3N2. Але ў некаторых краінах, у тым ліку ў Расіі і Беларусі, сярод выяўленых вірусаў грыпу пераважае H1N1, — адзначае Наталля Шмялёва. — Растлумачыць гэта можна, па-першае, тым, што апошнім часам мы менш падарожнічаем у краіны Паўночнай Амерыкі і Еўропы, таму ў віруса, які там цыркулюе, менш шанцаў трапіць у нашу краіну. Падругое, у краінах паўднёвага паўшар'я летам цыркуляваў варыянт H1N1 і меў усе магчымасці трапіць як у Расію, так і ў Беларусь. Менавіта ён атрымлівае ў нас пераважнае распаўсюджанне. Таксама рэгіструюцца выпадкі віруса грыпу B.

Сярод іншых вірусаў па-ранейшаму актуальныя SARS-COV-2, рэспіраторна-сінцытыяльны вірус, метапнеўмавірус, бакавірус, адэнавірус, парагрып, — дадала суразмоўца.

### ЗНОЎ «СВІНЫ»?

Сапраўды, у гэтым сезоне часта даводзіцца чуць пра «свіны» грып. Але спецыялісты ўпэўнены: ён згубіў сваю былую моц.

— Маецца на ўвазе каліфарнійскі грып — H1N1, які ў 2009 годзе быў пандэмічным, але з той пары згубіў свой пандэмічны патэнцыял, — тлумачыць **загадчык кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігар КАРПАЎ.** — Гэта натуральны працэс. Усяго з 1889 года было шэсць пандэмічных гадоў. Самая доўгая пандэмія, знакамітая «іспанка», працягвала 23 месяцы. Нікога палохаць у цяперашні момант «свіным» грыпам не трэба — гэта не пандэмічны вірус. Раней у нас дамінаваў сезонны H3N2, цяпер адбываецца яго замена на H1N1 — звычайная справа. Апасацца паўтарэння сітуацыі 2009 года, калі ён выклікаў пандэмію, не варта.

І ўсё ж зусім легкадумна ставіцца да гэтай інфекцыі не варта, асабліва людзям з груп рызыкі.

— Улічваючы тое, што з 2020 года з грыпам мы амаль не сустракаліся, цяпер вялікая колькасць яго выпадкаў, выкліканых варыянтам H1N1. На яго хварэюць тыя, хто нарадзіўся пасля 2009 года, і асабліва тыя, хто нарадзіўся ў 2020-м і пасля, бо ў іх дагэтуль не было з ім кантакту. Небяспечна гэта і для груп рызыкі — людзей, старэйшых за 65 гадоў, пацыентаў з імунадэфіцытамі і цукровым дыябетам. Гэтых людзей варта вакцынаваць, а ў ідэале — прышчапіць і тых, хто з імі кантактуе, — раіць **загадчык кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай дзяржаўнай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Юрый ГОРБІЧ.**

Чаму ж грып H1N1 атрымаў назву «свіны»? Зусім не таму, што на яго хварэюць гэтыя жывёлы.



— Вірусы шырока распаўсюджаны сярод вадаплаўных птушак. І ёсць жывыя арганізмы, дзе фарміруюцца больш дзеяздольныя для чалавека штамы, — тлумачыць Ігар Карпаў.

У дадзеным выпадку такім рэзервуарам і была свіння.

**«І ў дзяцей, і ў дарослых ёсць моманты, якія з'яўляюцца ключавымі сімптомамі трывогі. Гэта тэмпература, асабліва вышэйшая за 38 градусаў, якая не збіваецца гарачкапаніжальнымі сродкамі. Альбо часова збіваецца і вяртаецца да тых жа лічбаў і вышэй менш чым за дзве гадзіны. У такіх выпадках неабходна медыцынская дапамога».**

### ДЗЕЦІ ХВАРЭЮЦЬ ЧАСЦЕЙ

— Дзеці на грып хварэюць заўсёды часцей. Нярэдка да яго далучаецца рэспіраторна-сінцытыяльны вірус — гэта звычайная ВРВІ, якая працякае з рознай ступенню складанасці, але тут таксама варта быць пільным. Калі захворванне працякае клінічна значна, абавязковае аказанне медыцынскай дапамогі, — звяртае ўвагу Ігар Карпаў.

— Сёння дзеці інфіцыруюцца грыпам, адэна-, пнеўмавірусамі, SARS-COV-2 — няма дамінантнага віруса, — дадае Юрый Горбіч. — Пераважна гэта праяўленні ларынгіту — болі ў горле, асіпласць голасу, соплі. Цяжкія варыянты таксама прысутнічаюць, але іх значна меней. Так, сёлетні сезон вызначаецца больш раннім прыходам грыпу, але ў астатнім нічым не адрозніваецца ад дапандэмічных.

Паводле слоў **загадчыка аддзялення імунапрафілактыкі аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Кірыла ІГНАТАВА,** цяпер на долю дзяцей прыпадае больш за 62 % ад усіх рэспіраторных інфекцый. Пры гэтым размовы пра закрыццё школ і спыненне навучальнага працэсу не ідзе.

— Ні ў адной з устаноў адукацыі пакуль не дасягнуты 30 % парог захваральнасці на рэспіраторныя інфекцыі. Ён вызначаны адпаведнымі нормамі і правіламі, і пры яго дасягненні мясцовыя органы ўлады вырашаюць пытанне аб прыпыненні навучальнага працэсу, — дадаў Кірыл Ігнатаў.

Пры гэтым дагэтуль дзейнічае распараджэнне Міністэрства аховы здароўя, якое дазваляе дзецям знаходзіцца дома без даведкі ад урача да трох дзён.

### КАЛІ БЕЗ ДОКТАРА НЕ АБЫСЦІСЯ?

Нярэдка бывае, калі мы некалькі дзён чакаем дома, спадзеючыся, што захворванне пройдзе. Аднак ёсць сімптомы, з якімі без медыцынскай дапамогі не абысціся. І іх варта не прапусціць.

— І ў дзяцей, і ў дарослых ёсць моманты, якія з'яўляюцца ключавымі сімптомамі трывогі. Гэта тэмпература, асабліва вышэйшая за 38 градусаў, якая не збіваецца гарачкапаніжальнымі сродкамі. Альбо часова збіваецца і вяртаецца да тых жа лічбаў і вышэй менш чым за дзве гадзіны. У такіх выпадках неабходна медыцынская дапамога. Калі на фоне тэмпературы парушаецца прытомнасць, то таксама не трэба чакаць — такі чалавек мусіць быць у полі зроку ўрача як мага раней, — папярэджвае Юрый Горбіч.

### ЦІ ЧАКАЦЬ СЮРПРЫЗАЎ АД КАРАНАВІРУСА?

Юрый Горбіч адзначае, што ў найбліжэйшы час да нас прыйдуць два чарговыя варыянты каранавіруса — тыя, што дамінуюць у Еўропе і ў Азіі. Пакуль немагчыма прадказаць, які з іх першым захопіць лідарства. Але з іх з'яўленнем пачне расці ўдзельная вага каранавіруса сярод іншых рэспіраторных інфекцый.

Пры гэтым нядаўна кіраўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя выказаў спадзяванне, што пандэмія COVID-19 скончыцца ў 2023 годзе.

— Мы таксама спадзяёмся, што яна скончыцца, — кажа Юрый Горбіч. — Аднак што звычайна адбываецца? З'яўляецца вірус, які абыходзіць імунны адказ. З грыпам такое адбываецца кожныя 20—30 гадоў, калі з'яўляюцца новыя вірусы. А з каранавірусам — праз 3—6 месяцаў, калі ўзнікае варыянт, які абыходзіць імунітэт. І пакуль гэта адбываецца, пытанне заканчэння пандэміі застаецца адкрытым.

### МАСКІ І ВАКЦЫНЫ НЕ ГУБЛЯЮЦЬ АКТУАЛЬНАСЦІ

— Маскі пры блізкім кантакце не страцілі актуальнасці. Важнае дыстанцыяванне. А самае галоўнае — вакцынацыя. Пажылыя людзі пераносяць рэспіраторныя інфекцыі больш складана, і прышчапляць іх трэба абавязкова. Вакцынацыя прыводзіць да больш лёгкага і спрыяльнага ходу хваробы, — нагадвае Ігар Карпаў.

— Аналіз даных у эпідэмічны перыяд 2021/2022 гадоў паказаў, што захваральнасць на грып сярод прышчэпленых асоб была ў 9,6 раза ніжэй, чым сярод непрышчэпленых, — дадае Кірыл Ігнатаў.

Сёння ў Беларусі завершана кампанія вакцынацыі супраць грыпу. Прышчэплена больш за 3,7 мільёна чалавек, што складае больш за 40 % насельніцтва. У тым ліку прышчэплена 75 % асоб з груп высокай рызыкі развіцця неспрыяльных наступстваў. Гэта дзеці ва ўзросце ад 6 месяцаў да трох гадоў, дзеці і дарослыя з хранічнымі захворваннямі і імунадэфіцытнымі станамі, людзі, старэйшыя за 65 гадоў, і цяжарныя жанчыны.

Што датычыцца каранавіруснай інфекцыі, то больш за 70 % насельніцтва скончылі першасны курс вакцынацыі, больш за 80 % ад іх прайшлі бустарную вакцынацыю. У нашай краіне выкарыстоўваецца некалькі вакцын: расійскай вытворчасці «Гам-КОВІД-Вак», «Спадарожнік Лайт», а таксама кітайская і кубінская. Апошняя прымяняецца толькі для бустарнай вакцынацыі.

### ЦІ МОЖНА ЯШЧЭ ПРЫШЧАПІЦЦА АД ГРЫПУ?

Як адзначыў Кірыл Ігнатаў, нягледзячы на тое, што кампанія па вакцынацыі завершана, прышчэпку яшчэ можна зрабіць, але на платнай аснове — французскай вакцынай. У сваёй паліклініцы, абласным упраўленні аховы здароўя ці Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама варта ўдакладніць, дзе маецца гэты прэпарат.

**Алена КРАВЕЦ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

21 снежня 2022 г. № 49 (685)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


УДЗЯЧНАЯ ПАМЯЦЬ

# НЕ ПЕРАРВЕЦЦА СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

## Дзеля гэтага круглянскія дэпутаты разам са сваімі выбаршчыкамі ўвекавечваюць памяць у кампазіцыях і знаках












**«На жаль, сельскіх жыхароў становіцца ўсё менш. Раней у вёсках пражывала адразу тры пакаленні, старыя заўсёды былі пад наглядам. Зараз гэты ланцужок парушаны, моладзь з'язджае, застаюцца толькі тыя, хто пусціў карані на гэтай зямлі. І яны, на жаль, ужо немаладыя», — дзеліцца набалелым старшыня Круглянскага райсавета Сяргей ХРАМЦОЎ. Сёння на тэрыторыі Круглянскага раёна з 139 населеных пунктаў 88 з насельніцтвам менш як 20 чалавек. Яны састарэлыя, і вельмі важна не толькі стварыць камфортныя ўмовы для іх жыцця, але і захаваць гісторыю, каб яна не знікла разам з населенымі пунктамі.**

### МУЗЕЙ ПАСЯРОД ЛЕСУ

У лесе за чатыры кіламетры ад трасы стаіць памятны знак, на якім пазначана, што амаль усе жыхары вёскі з прыгожай назвай Бярозка — 47 з 52 — былі спаленыя карнікамі ў 1944 годзе. Нелюдзі разам з дарослымі забілі 22 дзіцяці. Пасля вайны населены пункт адрадзіўся, але з 2000 года там ніхто болей не жыве. Вясковыя сады, якія расквечвалі ў маі Бярозку белым духмяным кіпнем, заглушаныя елкамі ды асінамі. З усёй вёскі захаваўся адзіны дом, якраз непадалёк ад таго знака. І мясцовыя ўлады вырашылі стварыць у ім... музей.

— Гэта думка прыйшла да нас, калі мы працавалі над архіўнымі матэрыяламі аб генацыдзе мясцовага насельніцтва, — расказвае Сяргей Храмцоў. — На месцы былой вёскі ягадныя мясціны. Людзі пойдуць збіраць журавіны і змогуць зайсці ў гэты дом адпачыць — ён будзе адкрыты. Унутры на банерах размесцім інфармацыю з гісторыяй вёскі ад моманту яе з'яўлення да таго трагічнага дня, калі фашысты расстралялі жыхароў.

Дом ужо практычна вернуты да жыцця. Рэканструкцыю рабілі ў некалькі прыёмаў. Трэба было адрамантаваць дах, паставіць вокны, дзверы. На народнай будоўлі шчыравалі і прадстаўнікі райвыканкама на чале са старшынёй Сцяпанам Палоннікавым, і дэпутаты пад кіраўніцтвам Сяргея Храмцова, і супрацоўнікі розных службаў, і грамадскія арганізацыі, і моладзь, і жыхары.

— Наш праект называецца «Боль без тэрміну даўнасці», — удакладняе старшыня райсавета. — Тое, што дом будзе адкрыты, не страшна. Вандалаў мы не баімся. Калі людзі самі ўдзельнічаюць у стварэнні такіх месцаў, яны па-іншаму ставяцца да іх. Далучаем да гэтых спраў школьнікаў. Яны таксама ўдзельнічалі тут у суботніку. Хочацца, каб да моладзі дайшло разуменне, што вайна — гэта жах. І вельмі лёгка страціць краіну, калі яе не берагчы.

### ПА КІМ ЗВОНІЦЬ ЗВОН

*«З акта ад 26 снежня 1944 года № 55 раённай камісіі па ўліку злачынстваў і шкоды, прычыненай нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Круглянскаму раёну: «На тэрыторыі Круглянскага раёна расстраляна, павешана, спалена і сагнана ў нямецкае рабства 2365 чалавек».*

стар. 9

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



## У цэнтры ўвагі — бюджэт, здароўе дзяцей і лічбавыя тэхналогіі

### Расказваем асноўныя навіны мінулага тыдня Савета Рэспублікі

● У рэжыме відэаканферэнцыі адбылося пасяджэнне Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, на якім разгледжаны праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2023 год». Першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка адзначыла, што бюджэт фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2023 год сфарміраваны з улікам тэндэнцый яго выканання ў бягучым годзе і асноўных параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на наступны год. Законапраектам прадугледжаны даходы бюджэту фонду ў суме 25,2 млрд рублёў (116,4 працэнта да ацэнкі 2022 года), расходы — 24,7 млрд рублёў (116,3 працэнта). Асноўная сума расходаў традыцыйна будзе накіравана на фінансаванне пенсіённага забеспячэння грамадзян — 18,8 млрд рублёў (76,3 працэнта расходаў бюджэту фонду) і на выплату дапамог — 5,7 млрд рублёў (23 працэнты).

Старшыня Пастаяннай камісіі Таццяна Рунец падкрэсліла асаблівае сацыяльнае значэнне законапраекта. «У нашай краіне сістэмай пенсіённага забеспячэння ахоплена каля 2,4 млн грамадзян. У сярэднім за месяц праводзіцца каля 405 тысяч выплат дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, а таксама каля 370 тысяч выплат дапамог па часовай непрацаздольнасці», — адзначыла сенатар. Члены Пастаяннай камісіі прынялі рашэнне рэкамендаваць Савету Рэспублікі адобрыць гэты праект закона.

● Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч прыняў удзел у семінары-практыкуме «Захаванне здароўя навучэнцаў — прыярытэтны кірунак работы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі». У ходзе мерапрыемства прапанаваны вопыт работы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі Мінска па стварэнні здароўезберагальных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу. Па выніках семінара-практыкума падрыхтавана дарожная карта арганізацыі работы Міністэрства адукацыі, органаў кіравання адукацыяй, устаноў адукацыі па фарміраванні здароўезберагальнай сістэмы адукацыі.

● Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Сяргей Анюхоўскі ў рэжыме відэаканферэнцыі прыняў удзел у рабоце круглага стала па пытаннях прававога рэгулявання платформеннай занятасці ў краінах — удзельніцах Садружнасці Незалежных Дзяржаў. У ходзе дыскусіі абмеркаваны пытанні лічбавай трансфармацыі рынкаў працы і развіцця платформеннай занятасці, рэгулявання сферы працоўных адносін у Расіі і іншых краінах і інш. «У Беларусі, як і ва ўсім свеце, актыўна развіваюцца лічбавыя тэхналогіі, а разам з імі набірае папулярнасць платформенная занятасць. Таму прававое рэгуляванне гэтай сферы мае вялікае значэнне для скарачэння «ценявой эканомікі» ва ўсіх дзяржавах — удзельніцах СНД», — падкрэсліў сенатар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ШЧЫРАЯ РАЗМОВА

**Сяргей РАЧКОЎ:**

## «УНС умацуе падмурак устойлівасці Беларусі»

**У рамках адзінага Дня інфармавання старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў правёў сустрэчу з працоўным калектывам «Чыжоўкі-Арэны». Акцэнтамі сталі абмеркаванне Усебеларускага народнага сходу, унясенне навел у Выбарчы кодэкс, а таксама нестабільнасць знешнепалітычнай сітуацыі.**

— Цяпер у сусвеце сур'ёзная палітычная турбулентнасць, выкліканая рознымі наступствамі, у тым ліку пандэміяй і эканамічнымі крызісамі, — адзначыў Сяргей Рачкоў. — Рэспубліка Беларусь не ізалявана, яна ўваходзіць у сусветны парадак: мы выбудоўвалі і будуем зараз мірную знешнюю палітыку. Наша краіна — экспартаарыентаваная, больш за 60 працэнтаў таго, што вырабляем, павінны прадаваць. Мы ўманціраваны ў сусветную эканамічную сістэму, акрамя таго, на Беларусь, з прычыны яе геаграфічнага становішча, заўсёды аказваўся ціск. Але мы заўсёды супрацьстаялі гэтаму: апошнія трыццаць гадоў мы ўсе працавалі вельмі шмат і здолелі на абломках Савецкага Саюза стварыць устойлівую эканоміку, аднавілі прамысловасць і развілі сельскую гаспадарку.

Працягваючы думку, Сяргей Рачкоў скіраваў увагу ўдзельнікаў сустрэчы на тое, што нестабільная сітуацыя ў свеце падштурхнула кіраўніцтва краіны да прыняцця рашэнняў, якія скарэкціруюць прамысловую, эканамічную і знешнеэканамічную палітыку Беларусі.

— Мы нарошчваем пастаўкі ў краіны так званай далёкай дугі: для нас вельмі перспектыўным з'яўляецца азіяцкі рэгіён, тыя краіны, якія гатовы сур'ёзна з намі супрацоўнічаць, — падкрэсліў член Савета Рэспублікі.

Падчас адзінага Дня інфармавання Сяргей Рачкоў таксама распавёў супрацоўнікам «Чыжоўка-Арэны» аб Усебеларускім народным сходзе і яго ролі ў грамадскім жыцці. Спікер адзначыў, што канстытуцыйнае замацаванне УНС іграе вялікую ролю:

— Вяртаючыся да турбулентнасці, якая існуе ў свеце, і спроб расхістаць нашу дзяржаву... На мой погляд УНС дазволіць умацаваць падмурак устойлівасці Беларусі. Дэлегаты будуць прадстаўляць фактычна ўсе слаі нашага грамадства, менавіта праз гэты механізм можна будзе абмяркоўваць стратэгію сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, пытанні знешняй палітыкі — важныя і канцэптуальныя тэмы, якія турбуюць наша насельніцтва.

Член Савета Рэспублікі таксама закрануў тэму ўнясення змяненняў у Выбарчы кодэкс. Спікер акцэнтаваў увагу на некаторых навацыях. Так, для кандыдатаў у прэзідэнты павялічаць да 40 гадоў узроставы цэнз і да 20 гадоў — цэнз аседласці. Акрамя таго, устаноўлена не больш за два тэрміны, на якія можа быць абрана прэзідэнтам адна і тая ж асоба. Асобы, якім устаноўлена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, цяпер змогуць прымаць удзел у галасаванні. Як адзначыў Сяргей Рачкоў, з-за пераарыентацыі знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці выбарчых участкаў на тэрыторыях іншых краін больш не будзе.

Звяртаючыся да супрацоўнікаў «Чыжоўкі-Арэны», спікер адзначыў:

— Ваш аб'ект выконвае важную сацыяльную функцыю: вы працуеце з нашым падрастаючым пакаленнем, дапамагаеце нашай моладзі станавіцца мацнейшай, быць патрыётамі. Вельмі важна любіць сваю Радзіму, тое месца, дзе жывеш. Гэта дапамагае выстаяць у такі турбулентны час.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# «ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ ВАЖНА МЕЦЬ МАЖЛІВАСЦЬ ЗВЯРНУЦЦА ДА ОРГАНАЎ УЛАДЫ НАПРАМУЮ»

## Кіраўнік дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ аб выніках гэтага года і планах на будучы



**— Уладзімір Уладзіміравіч, практыка правядзення выязных прыёмаў грамадзян і прамых тэлефонных ліній з'яўляецца інструментам прамога ўзаемадзеяння органаў улады з насельніцтвам. Вы ўжо адзначалі, што з кожным разам зваротаў становіцца менш, але яны ёсць: работа ЖКГ, рамонт дарог, медыцынскае абслугоўванне. А як часта да вас як да старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў звяртаюцца людзі з нетыповымі, асабістымі праблемамі?**

— З упэўненасцю магу сказаць, што даволі часта. Работа з насельніцтвам вядзецца пастаянна, людзі звяртаюцца ў Савет дэпутатаў не толькі падчас тэлефонных ліній і выязных прыёмаў, але і пры асабістай сустрэчы. Мой рабочы нумар тэлефона ў свабодным доступе, таму рэгулярна паступаюць званкі з просьбай вырашыць тую ці іншую праблему. Прыемна, што часта паступаюць пазітыўныя водгукі па ўжо вырашаных пытаннях. Людзі звяртаюцца з рознай нагоды: праблемы са здароўем, працаўладкаванне, месца ў дзіцячым садку, пытанні з арэндным жыллём — цяжка вылучыць штосьці канкрэтнае, але магчымая дапамога аказваецца ўсім.

**— Атрымліваецца, што ваша пасада даўно выйшла з дзяржурнага 8-гадзіннага графіка і стала ўжо часткай жыцця?**

— Правільна будзе сказаць — ладам жыцця. Пастаянная работа з людзьмі патрабуе заўсёды быць на сувязі, у цэнтры падзей. Адсюль і позні вяртанні дадому, вырашэнне рабочых момантаў у суботу і нядзелю, сустрэчы з насельніцтвам у аддаленых населеных пунктах паўночнага рэгіёна. Для людзей важна мець магчымасць звяртацца да органаў улады напрамую, ведаць, што кожны з кіраўніцтва вобласці зацікаўлены ў вырашэнні пытанняў, якія могуць палепшыць узровень жыцця грамадзян і іх населенага пункта.

**— На Віцебшчыне праводзіцца вялікая сацыяльная работа з пажылымі і людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі. Яркім прыкладам з'яўляецца Цэнтр сацыяльна-працоўнай, бытавой і фізічнай рэабілітацыі інвалідаў у Лепелі, аналагаў якому пакуль у краіне няма. Грунтуючыся на вопыце гэтай і іншых сацыяльных устаноў, якія праекты плануецца рэалізаваць у будучым годзе?**

— Фінальным этапам праекта, рэалізаванага ў Лепелі, з'яўляецца Цэнтр сацыяльнай рэабілітацыі, навучання, пражывання інвалідаў і часовага прытулку, які адкрыўся ў верасні бягучага года. Безумоўна, гэта яшчэ адзін вялікі крок насустрач людзям з абмежаванымі магчымасцямі, бо ў цэнтры могуць часова пражываць не толькі жыхары Лепельшчыны, але і ўсёй вобласці, дзе спецыялісты аказваюць неабходную дапамогу ў камфортных для наведвальнікаў умовах.

На мой погляд, такімі ж яркімі прыкладамі з'яўляецца адкрыццё філіялаў тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ў вёсках і аграгарадках. Практыка паказвае, што ў невялікіх населеных пунктах пражывае шмат людзей «залатога» ўзросту, для якіх адзіным месцам адпачынку ў кампаніі сяброў і аднадумцаў з'яўляюцца аддзяленні дзённага знаходжання. Часта менавіта на пенсіі ў грамадзян праяўляюцца мастацкія, вакальныя і іншыя здольнасці, якія паспяхова рэалізоўваюцца ў ТЦСАН. У пачатку снежня такі філіял быў адкрыты ў аграгарадку Бычыха Гарадоцкага раёна, дзе пражываюць звыш 300 чалавек пенсіённага ўзросту, якія з ахвотай наведваюць гурткі па інтарэсах, адзначаюць разам святы, ладзяць майстар-класы. У наступным годзе плануецца адкрыццё яшчэ аднаго філіяла Гарадоцкага ТЦСАН у Езярышчы, работа ў гэтым кірунку будзе працягвацца і ў іншых раёнах вобласці. Нездарма ўзровень сацыяльнай засцярогі ў паўночным рэгіёне на працягу дзесяці гадоў застаецца адным з самых высокіх у краіне. Ніжэй за другое месца па сацыяльным абслугоўванні насельніцтва мы не спускаемся (у тым ліку і па інтэрнатных установах).

**— У 2023 годзе Гарадок будзе прымаць удзельнікаў і гасцей XXX юбілейнага Дня беларускага пісьменства. Што для віцебскай зямлі значыць гэта маштабнае гістарычна-культурнае свята і якія сюрпрызы рыхтуюць арганізатары для ахвотных прайсці з Тарасам на Парнас?**

— Для нас гэта, безумоўна, вялікі гонар, бо не толькі наш паўночны рэгіён разглядаўся як пляцоўка для правядзення свята. Развітая інфраструктура Гарадка, яго багатая гістарычная і літаратурная спадчына сталі падставай для абрання горада сцэнай юбілейнага Дня беларускага пісьменства.

Цяпер ідзе фарміраванне бюджэту, разглядаюцца сацыяльна значныя аб'екты, якія да верасня 2023 набудуць новы выгляд, ствараюцца праекты архітэктурных упрыгожванняў горада. Культурная праграма пакуль застаецца сакрэтам, але ў ёй мы пастараемся адлюстраваць значныя брэндавыя мерапрыемствы Гарадоччыны, адно з іх — традыцыйны «Гарадоцкі Парнас». Канешне, будзе арганізавана вялікая пляцоўка майстроў народнай творчасці, пройдуць літаратурныя і мастацкія майстар-класы — адным словам, для кожнага госця і ўдзельніка знойдзецца напрамак па інтарэсах.

Літаратурны брэнд Гарадка — паэма «Тарас на Парнасе» Канстанціна Вераніцына. У населеным пункце ёсць скульптура галоўнага героя твора і памятны камень з шыльдай. У планах — узвесці помнік аўтару. Які ён будзе — яшчэ адзін сакрэт, бо партрэтаў Вераніцына літаратурная спадчына, на жаль, не захавала. На фасадах будынкаў з'явяцца муралы з сюжэтамі паэмы, разынкай свята стане спектакль.

Гарадок — шыкоўная пляцоўка для правядзення не толькі рэгіянальных, але і рэспубліканскіх мерапрыемстваў. Сучасны выгляд ён набыў яшчэ ў 2013 годзе, цяпер адрамантуем дарожнае палатно, заменім гарадское асвятленне, добраўпарадкуем тэрыторыі ўстаноў і арганізацый, абсталюем новыя месцы адпачынку. Галоўнае, што ў жыхароў застануцца ад свята не толькі яркія ўспаміны, але і абноўленая гарадская інфраструктура.

**— Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь заўсёды было раўнамернае развіццё рэгіёнаў. Нягледзячы на міграцыю сельскага насельніцтва ў гарады ў пошуках працоўных месцаў, у райцэнтрах і вёсках ёсць нямала прыкладаў паспяховага развіцця малога бізнесу. Як ідуць справы на Віцебшчыне?**

— У апошнія пяць гадоў бурна развіваецца напрамак агратурызму, асабліва ў багатых на флору і фаўну раёнах — Браслаўшчыне, Мёршчыне, Пастаўскім краі, Глыбокім. З'яўляюцца індывідуальныя прадпрымальнікі, якія адраджаюць народныя рамёствы: кавальства, ганчарства, саломапляценне. Асабліва прыемна, што ў аграгарадках з'яўляюцца новыя працоўныя месцы на базах малых швейных і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў. Дзяржава аказвае дапамогу ў развіцці прадпрымальніцтва ў населеных пунктах у выглядзе значных падатковых паслабленняў, але гаварыць аб масавым развіцці яшчэ рана. Ёсць выдатныя лакальныя прыклады.

У Багушэўску сям'я Шухто на базе былой нарыхтоўчай канторы стварыла цэлы гандлёвы комплекс, у склад якога ўваходзяць прадуктовая і гаспадарчая крамы, станцыя тэхнічнага абслугоўвання аўтамабіляў — з'явілася звыш дзесяці новых працоўных месцаў для мясцовых жыхароў. У Новалукомлі сям'я Калініных са старога кінатэатра зрабіла цэнтр сямейнага адпачынку для дзяцей і падлеткаў, які сёння з'яўляецца адным з галоўных сацыяльных аб'ектаў горада.

Немалаважна, што сёння галіна сельскай гаспадаркі паспяхова пераходзіць у прадпрымальніцтва: з'яўляюцца фермерскія гаспадаркі, сыраварні. Цікава, што за гэтым часта стаяць людзі-авантурысты, якія змянілі гарадскую прапіску на вясковую. Экапрадукцыя сёння карыстаецца вялікім попытам, таму дзе-нідзе з'яўляюцца прадпрыемствы са сваімі адметнасцямі. Такіх прыкладаў няшмат, але я лічу, што менавіта ў гэтай сферы і не трэба масавасці, бо тады прадукты вытворчасці згубяць унікальнасць.

**— У гэтым хлебаробчым сезоне Віцебшчына паставіла новы рэкорд — перасягнула мільённы намалот. Спадзяёмся, што ў будучым годзе аграрыі паўночнага рэгіёна возьмуць новыя вяршыні, тым больш што пляцоўка для наступных «Дажынак» ужо абрана — эстафету прымае Шаркаўшчына. Якую канцэпцыю для правядзення свята працаўнікоў вёскі абралі арганізатары?**

— Штогод імкнёмся вылучыць тэрытарыяльны брэнд горада, які становіцца пляцоўкай для правядзення аграрнага свята. На Шаркаўшчыне гэта зялёны яблык беларускага сорту «Памяць Сікоры», звязаны з садаводам-селекцыянерам Іванам Сікорам, які нарадзіўся і працаваў у гэтым раёне.

Я ўзначальваю арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы «Дажынак», гэтыя будуць ужо адзінаццатымі ў маёй прафесійнай дзейнасці. Сёлета мы з калегамі вырашылі адлюстраваць канцэпцыю зялёнага яблыка ў першую чаргу на будынках: плануецца, што фасады жылых дамоў будуць пафарбаваны ў белы, шэры і ўсемажлівыя адценні зялёнага. Канцэпцыя працягнецца і ў новых архітэктурных формах, якія будуць усталяваны ў зялёных зонах адпачынку.

Новы выгляд набудуць Дом культуры, дзіцячая школа мастацтваў. Запланаваны капітальны і бягучы рамонт звыш 30 жылых дамоў, будзе заменена дарожнае палатно, адрамантаваны тратуары і масты. Плануецца будаўніцтва новага фізкультурна-аздараўленчага комплексу. А галоўнае — гарпасёлак нарэшце набудзе сваё адметнае аблічча.

**— На парозе Новы, 2023, год. Чаго хацелася б пажадаць краіне?**

— Адназначна міру. Так здарылася, што ва ўмовах нялёгкай эпідэмічнай сітуацыі на першым месцы стаяла здароўе — яно, безумоўна, з'яўляецца галоўнай каштоўнасцю для кожнага. А ўсім нам і нашым суседзям сёння хачу пажадаць мірнага неба і дабрабыту.

**Гутарыла Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

# І ПСІХОЛАГ, І ТРАЦЕЙСКІ СУДДЗЯ...

## Як вырашае жыццёвыя спрэчкі дэпутат райсавета з Ваўкавыска

**АЛЯКСАНДР ВАРЧАК не належыць да катэгорыі дэпутатаў-кіраўнікоў. Ён працуе старшым электрамеханікам у Баранавіцкім аддзяленні Беларускай чыгункі. Праводзіць тэхналагічнае абслугоўванне і рамонт сігналізацыі і сувязі. Дэпутацкія клопаты — яго грамадскі абавязак. Тут зона дзеяння — прамысловы раён Ваўкавыска. «Гэта даволі складаная частка горада, — зазначыў падчас сустрэчы старшыня райсавета Віталь НАВІЦКІ. — Тут трэба вельмі ўзважана падыходзіць да работы, ведаць настрой мікрараёна. Аляксандр якраз з тых людзей, што ўмеюць знайсці агульную мову з кожным. Ён у поўнай ступені апраўдвае свой дэпутацкі статус». Сам Аляксандр Варчак расказаў карэспандэнту «Звязды», з якімі нечаканымі пытаннямі даводзіцца сутыкацца па родзе дэпутацкай дзейнасці.**

Напачатку аб самой асобе дэпутата, бо ў значнай ступені вырашэнне той ці іншай праблемы залежыць ад асаблівасці характару чалавека. Аляксандру 38 гадоў, жанаты, першынцу няма яшчэ і двух гадоў. Сваімі вызначальнымі рысамі называе мэтанакіраванасць і ўпартасць. «Калі паставіў перад сабой мэту, трэба яе дасягнуць, — лічыць Аляксандр. — І вынік абавязкова павінен быць. Пажадана, станоўчы». Такі падыход ён акрэсліў і ў сваёй дэпутацкай дзейнасці.

Аляксандра можна назваць дэпутатам са стажам — працуе на гэтай грамадскай пасадзе другі тэрмін. Напачатку ўяўляў гэту працу даволі павярхоўна. Ведаў, што дэпутаты ў парламенце прымаюць законы, а вось работа мясцовых Саветаў была не вельмі зразумелай. Але адразу пасля абрання стаў цікавіцца, пераймаў вопыт у іншых, асабліва, хто працаваў некалькі тэрмінаў склікання. Паступова і сам набыў такі вопыт. Мабыць, удала, бо пасля таго як кіраўніцтва раённага камітэта КПБ вылучыла Аляксандра на другі тэрмін, выбаршчыкі яго кандыдатуру падтрымалі. «Людзі



аказалі мне давер другі раз, ды і самога работа цікавіла. Асабліва прыемна, калі людзі дзякуюць за дапамогу. Значыць, у тваіх сілах нешта зрабіць», — перакананы народны выбраннік.

Акруга ў Аляксандра не сказаць што малая — у яго прамысловым раёне пражывае каля паўтары тысячы чалавек. Даволі значны тут і прыватны сектар. Звяртаюцца да дэпутата ў асноўным з бытавымі пытаннямі, па большасці са сферы ЖКГ. Гэта рамонт дамоў, добраўпарадкаванне тэрыторый, дарожнае пакрыццё, устаноўка лавак у дварах і каля пад'ездаў і іншае. Цікаўлюся, ці хапае паўнамоцтваў у дэпутата вырашыць гэтыя праблемы?

— Калі ўзяць раённы ўзровень, паўнамоцтваў хапае, — упэўнены суразмоўца. — Тым больш, кіраўнікі прадпрыемстваў, у тым ліку ЖКГ, заўсёды ідуць насустрач. Напрыклад, былі звароты па ямачным рамонце двароў у прыватным сектары. Рэльеф у нас гарысты, пры ліўнях вада ідзе хутка, дарогі падмывае. Людзі просяць прагрэйдзіраваць. Я афармляю дэпутацкі запыт і адсылаю ў ЖКГ. Згодна з заканадаўствам, адтуль павінен быць адказ. Як правіла, у ім прапісваюцца тэрміны выканання дэпутацкага звароту. Трэба сказаць, што ў камунальнай гаспадарцы імкнуцца дапамагчы, нават калі ў іх загружанасць. Такім чынам, ямачны рамонт быў зроблены на працягу двух тыдняў.

Узгадаў Аляксандр і рамонт у шматпавярховіку. У аварыйным стане быў уваход у падвал. Дэпутат звярнуўся ў фінансавы аддзел райвыканкама, каб даведацца, ці патрэбен для гэтай работы праект. Кажа, што без грунтоўнага аналізу сітуацыі не хацеў людзям загадзя абяцаць. Пасля запыту былі распачатыя работы па рамонце. Жыхары дома, успамінае дэпутат, пры сустрэчы дзякавалі яму, бо шмат гадоў пытанне не маглі вырашыць. Дом хоць і абследавалі, але ўсё заставалася на ўзроўні абяцанняў.

Прыпомніў Аляксандр і аналагічную сітуацыю з добраўпарадкаваннем ганка ў шматкватэрным доме. Людзі скардзіліся ў камунальную службу, што прыступкі сыплюцца, па іх нязручна хадзіць. Адтуль атрымалі адказ, што камунальнікі загружаны, трэба пачакаць. Пасля звароту дэпутата работа па рамонце ганка была выканана на працягу месяца. «Людзі звяртаюцца не толькі падчас прыёмаў ці тэлефануюць у раённы Савет дэпутатаў, але і пры асабістай сустрэчы могуць расказаць аб нейкай праблеме альбо выказаць падзяку за вырашэнне таго ці іншага пытання. Прычым самі спыняюць, ведаюць мяне ў твар», — зазначае суразмоўца.

Дэпутату даводзіцца вырашаць і розныя спрэчныя пытанні паміж жыхарамі, быць, што называецца, у ролі трацейскага суддзі, а ў нейкай ступені яшчэ і псіхолагам.

Канфлікты, як правіла, бываюць з-за якіх-небудзь тэрытарыяльных прэтэнзій. Напрыклад, жылы дом разлічаны на пражыванне дзвюх сем'яў, як кажуць, на два канцы. Вакол дома ўчастак. І вось гэты ўчастак становіцца прадметам разладу паміж людзьмі.

— Мужчына пенсіённага ўзросту, які жыў у адной палове дома, забараніў суседзям з другой хадзіць па «яго» дарожцы. Маўляў, абыходзьце вакол дома. Але дарожка вядзе адразу на цэнтральную вуліцу, а з другога канца дома выходзіць на завулак, што значна павялічвала адлегласць. Гаспадар участка мог бы і дазволіць, каб той дарожкай, якая ўжо ёсць, маглі карыстацца і суседзі, бяды тут ніякай няма. Прыйшлося гаварыць з гаспадаром, у выніку ён пайшоў на ўступкі, — расказвае Аляксандр пра жыццёвыя выпадак і здзіўляецца, як гэта людзі не могуць паміж сабой дамовіцца. Здавалася б, справа зусім простая...

Былі выпадкі, калі суседзі не маглі падзяліць паміж сабой тэрыторыю. Як можа дапамагчы дэпутат? Напрыклад, падказаць, куды звярнуцца з гэтым пытаннем, як правільна дакументальна аформіць, акрэсліць алгарытм іх дзеянняў, прасачыць, каб гэта просьба не завісла недзе ў кабінетах.

Даводзіцца дэпутату мець справу і з «прафесійнымі скаржнікамі». Такімі, напрыклад, як жанчына, якая пражывае ў прыватным сектары ў доме на тры кватэры. Яна заўсёды ў прэтэнзіі на сваіх суседзяў. Прытым, што тыя там пастаянна не пражываюць, а прыязджаюць час ад часу. Жанчына неаднаразова выклікала міліцыю, але фактаў парушэння не знаходзілі. Да яе шукалі розны падыход, каб дапамагчы. Нават падключыліся прафсаюзы. З'явілася даволі нестандартная прапанова дапамагчы ёй з пуцёўкай у санаторый на адпачынак.

— Такія жыццёвыя пытанні трэба вырашаць толькі па-добраму, без націску і пагроз. Інакш у адказ таксама можна атрымаць негатыўную рэакцыю, — упэўнены Аляксандр. — Як правіла, такія паводзіны могуць быць вынікам нейкіх жыццёвых непаладак, праблем, гэта выліваецца ў грамадскі канфлікт. Таму тут трэба дзейнічаць з чалавечых пазіцый. І пры гэтым вытрымліваць нейтралітэт у спрэчках.

Аляксандр Варчак прызнаецца, што выступаць у ролі міратворца яму дапамагае не толькі яго пасада, але і памяркоўны характар. Ён лічыць, што ўсе пытанні трэба вырашаць па-добраму, мірна. А ўзамен атрымлівае нармальныя адносіны ад усіх канфліктных бакоў. Кажа, ніхто не злуецца, пры сустрэчы ўсе заўсёды вітаюцца.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

# НЕ ПЕРАРВЕЦЦА СУВЯЗЬ ПАКАЛЕННЯЎ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

Гэтыя лічбы можна ўбачыць на помніку яшчэ ў адным памятным месцы, якое знаходзіцца на старых яўрэйскіх могілках у Круглым.

— Архіўныя дакументы пралілі святло на падзеі 80-гадовай даўніны, — расказвае Сяргей Храмцоў. — Да нас трапілі спісы расстраляных і сагнаных у Германію людзей, сведчанні відавочцаў. Па тых успамінах мы аднавілі апошнія моманты жыцця людзей, якія былі расстраляныя на яўрэйскіх могілках. З удзелам жыхароў і пры іх фінансавай дапамозе мы ўстанавілі памятны знак. Праект называецца «Памяць расстраляць немагчыма».

У тым месцы, дзе, па сведчаннях відавочцаў, было расстраляна некалькі соцень людзей, зараз памятная кампазіцыя.

На гранітных дошках пазначаны словы відавочцаў. Ад успамінаў А. П. Новікава, 1908 года нараджэння, мароз па скуры. «Я пражываў на краі вёскі непадалёк ад яўрэйскіх могілак, дзе ў асноўным праводзіліся расстрэлы. Малалетніх дзяцей наогул менш стралялі, у асноўным забівалі палкай і хавалі жывымі, маладых дзяўчат збівалі да страты прытомнасці, пасля гвалцілі і расстрэльвалі».

Тут усё прасякнута трагізмам. На вялікім камені дошка з заклі-



**Узнагародай за праект «Памяць расстраляць немагчыма» Сяргей ХРАМЦОЎ ганарыцца асабліва.**

кам да прахожых, каб прыпыніліся і схілілі галаву перад тымі, у каго адабрала жыццё вайна. За каменем жалезны масток праз роў і металічная канструкцыя са званам, які нагадвае пра трагічныя падзеі. Ён зроблены з падручнага матэрыялу — газавага балона і дыска з трактара майстравітымі круглянскімі жыхарамі. На стварэнне гэтага месца і ўвекавечанне памяці землякоў жыхары сабралі сем тысяч рублёў.

На абласным форуме ўстойлівага развіцця, які прайшоў падчас нядаўняга эканамічнага форуму «Млын поспеху», былі вызначаны найлепшыя раённыя праекты. Круглянская ініцыятыва «Памяць расстраляць немагчыма» заняла другое месца.

### Ад каранёў нашых

Менавіта пад такой назвай матэрыялізаваўся ў Круглым на рацэ Друць кавалачак старадаўняй гісторыі. Ініцыятарам выступіў дзіцячы парламент, а дэпутаты разам з выканаўчай уладай падтрымалі.

— Дзецям было цікава акунуцца ў нашу гісторыю, — расказвае, з чаго ўсё пачалося, Сяргей Храмцоў. — Мяркуем, што праз Круглае пралягаў адзін са шляхоў «З вараг у грэкі». Школьнікі прапанавалі гэты факт праілюстраваць. На рэчцы ёсць астравок. Летась мы перакінулі да яго невялічкі мост, устанавілі арку і інфармацыйныя шчыты з падрабязнай інфармацыяй, хто мы і адкуль. Адзін стэнд расказвае пра крывічаў, нашых продкаў, другі — пра гэты гандлёвы шлях. Сёлета дапоўнілі карцінку старадаўняй ладдзёй. Зараз гэта адна з любімых у гараджан зон адпачынку.

Ёсць яшчэ адна цікавая ідэя, якая, на думку суразмоўцы, спадабаецца дзецям.

— У кнізе «Памяць» нашага раёна ёсць інфармацыя, што ў 1941-м, калі немцы наступалі, у раёне населенага пункта Храпы некалькі чырвонаармейцаў, якія ацалелі ў баях, схавалі сцяг палка, — расказвае ён. — Пасля вайны нехта з іх прыязджаў, шукаў гэты сцяг, але безвынікова. Ва ўспамінах ён патлумачыў гэта тым, што час змяніў мясцовасць да непазнавальнасці. Мы ж збіраемся рызыкнуць і зладзіць пошукі. Нават карту здабылі 1936 года, каб прасцей было арыентавацца. Прыдумаем які-небудзь квэст для школьнікаў і адправімся ў экспедыцыю. Было б цікава знайсці такі сімвалічны рарытэт.

### Ад вытокаў да сучаснасці

Ідэі ад народа самыя дзейсныя. Важна толькі, каб яны не замоўчваліся, а прагаворваліся. Калі яны рэальныя, ды і насельніцтва не супраць паўдзельнічаць, іх няцяжка рэалізаваць.

— У гэтым пытанні ў нас асноўныя памочнікі органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, — расказвае Сяргей Храмцоў. — Гэта пасіянарныя, ініцыятыўныя людзі, праз якіх мы трымаем сувязь і маніторым сітуацыю ў населеных пунктах. І з гэтых сустрэч нараджаюцца праекты ад жыцця, звязаныя са стаўленнем да роднай зямлі, памяці продкаў. За апошнія гады дзякуючы ініцыятыве і садзейнічанню нашых жыхароў мы падтрымалі шмат ініцыятыў. Гэта крынічка каля Цяцерынскай школы, якую мы аднавілі літы з нуля. Яшчэ дзве адноўленыя крыніцы знаходзяцца каля Цяцерынскай ГЭС і ў Новым Палессі. Гэта таксама на тэрыторыі Філатаўскага сельсавета.

Крынічка каля школы нагадвае невялічкае квадратнае азярцо са сцяжынкай здароўя. Розныя пераходы, невялічкія масткі, альтанка, журавель робяць аб'ект яшчэ больш маляўнічым і аўтэнтычным. Да яшчэ адной крынічкі шлях вядзе праз лясны масіў да ракі Друць. Збіцца з дарогі не даюць маршрутныя паказальнікі на дрэвах. Калі што — арыенцір Цяцерынская ГЭС. Дарэчы, таксама цікавы аб'ект савецкага перыяду.

Тутэйшая крыніца — адна з вядомых мясцовых славутасцяў. Кажуць, што калі акунуцца ў яе, забудзешся пра любыя хваробы. Для купелі зроблена спецыяльнае памяшканне з цывільным спускам і лаўкамі.

— У нас тут, як у Жыровічах, усё па фота рабілі, — удакладняе мой гід. — На Вадохрышча людзей збіраецца вельмі шмат. Каб было зручна перамяшчацца — мясцовасць жа ўзгорыстая, — ліхтары паставілі.

Па суседстве з купеллю прасторная зона адпачынку з альтанкамі і арэлямі. І што сапраўды радуе — вакол чысціня і парадак. Як той казаў: шануй сваё.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*Круглянскі раён.*

# ЭСТАФЕТА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ



## Стараста вёскі з Ганцаўшчыны кіруе мастацкай самадзейнасцю і захоўвае звесткі пра мінулае вёскі

**У канцы восені ў Задуб'і адкрывалі памятны знак, прысвечаны трагічным падзеям 1943—1944 гадоў. Тады палескую вёску, размешчаную сярод лясоў, палілі карнікі. Гэта рабілі двойчы: адзін раз у канцы 43-га года, другі — у пачатку 44-га. За два разы акупанты знішчылі 149 хат, забілі 48 жыхароў. Помнік быў і да гэтага, а цяпер вырашылі зрабіць яшчэ адзін, больш сучасны, відовішчны, інфармацыйны. Пры падрыхтоўцы да адкрыцця памятнага знака звярнуліся да гістарычных звестак. Высветлілася, што іх беражліва захоўвае мясцовы бібліятэкар, яна ж стараста вёскі, Ірына ВАЛАСЮК.**

Адных старастаў вёсак выбіраюць на сходах па прапановах жыхароў, іншых настойліва рэкамендуе сельскі Савет. У выпадку з Ірынай Валасюк выйшла крыху інакш. Паводле слоў **старшыні Малькавіцкага сельвыканкама Таццяны ЛІТВІНОВІЧ,** Ірына Барысаўна даўно была тут нефармальным лідарам. Яна загадвае сельскім клубам-бібліятэкай, вакол яе будуецца ўсё грамадскае жыццё населенага пункта. Яе вылучэнне на пасаду старасты стала фармальным прызнаннем нефармальнага статусу.

— Большая частка жыхароў Задуб'я — пенсіянеры, — гаворыць кіраўнік мясцовай улады. — Ірына Валасюк жыве тут даўно, кожнага ведае, да ўсіх мае свой падыход. Палова вёскі — яе чытачы, яшчэ частка — удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Вясковы клуб не прастойвае, служыць сапраўдным культурным асяродкам. Гэта адчуваецца на любым мерапрыемстве, асабліва калі летам праводзім свята вёскі. У Ірыны Барысаўны ёсць матэрыялы, звесткі пра кожнага чалавека: яго таленты, захапленні, заслугі. Таму і атрымліваюцца змястоўныя сцэнарыі мерапрыемстваў, таму і выказваюць людзі падзяку за арганізаванае свята. Калі ні зойдзеш увечары ў клуб, там абавязкова сустрэнеш людзей, а гэта самае важнае, — падсумоўвае Таццяна Літвіновіч.



Ірына Валасюк расказала, што працуе ў гэтай бібліятэцы вельмі даўно. Фактычна ўсё працоўнае жыццё прайшло ў Задуб'і. Тут вырастала з мужам дзяцей, дачакаліся ўнукаў. Раней у вёсцы была базавая школа. Гадоў дзесяць таму яе закрылі па вядомай прычыне — вучняў стала мала. Цяпер у вёсцы засталося ўсяго пяць школьнікаў, якіх кожны дзень адвозіць на заняткі ў Малькавічы школьны аўтобус. Ёсць яшчэ ў населеным пункце ФАП, крама, пошта.

— Пражывае зараз каля 150 чалавек, хоць зарэгістравана значна больш, — расказвае стараста. — Маладыя людзі заканчваюць школу, атрымліваюць адукацыю, стараюцца знайсці працу ў сталіцы. Жыллё здымаюць, а рэгістрацыя застаецца вясковая. Такіх у нас многа, моладзь арыентаваная найперш на добрую работу. А ў вёсцы пражывае шмат пенсіянераў.

Але мы стараемся жыць няспокойна. Ёсць у нас фальклорны калектыў «Пярэзвы»: касцяк — сем чалавек, сапраўдныя таленты, — працягвае Ірына Барысаўна. — У праграме калектыву ў асноўным народныя песні. Нас заўсёды чакаюць не толькі ў сваім клубе — запрашаюць і ў суседнія вёскі, і мы з задавальненнем выступаем. Вось і зараз рыхтуем калядную праграму, будзем віншаваць са святамі сваіх аднавяскоўцаў, а калі запросяць «на гастролі» — выступім і ў суседзяў. З задавальненнем удзельнічаем, напрыклад, у зажынках, дажынках. Сёлета выступалі ў полі. І нашы жанчынкі расчуліліся, успомнілі песні сваіх матуль, бабуль, механізатарам узнялі настрой, яны шчыра дзякавалі. Свята вёскі, вядома, без нас не бывае. Вызначыліся і на раённых конкурсах, аглядах. Сабралі ўжо цэлы стос розных дыпломаў, адзнак за ўдзел у конкурсе патрыятычнай песні, у мерапрыемстве «Талака Ганцаўшчыны», іншых.

Работа па захаванні гістарычнай памяці сваёй вёскі — асаблівы раздзел клопатаў старасты і бібліятэкара. Ірына Барысаўна падхапіла эстафету былой школы. У яе бытнасць энтузіястам гэтай работы доўга заставалася настаўніца Святлана Навіцкая. Святлана Цімафееўна працавала нават у сталічным архіве. Адтуль прывезла бясцэнныя звесткі пра трагічныя падзеі ваеннага часу, зрабіла копіі паказанняў відавочцаў тых страшных карных аперацый. Ёсць сведчанні, напрыклад, Марыі Малышкі. Жанчына расказвала, як спалілі яе хату з мужам і дачкой. Ёй хоць і пашчасціла выратавацца, але хутка пасля гэтага пахавала маленькага сына, не ўдалося захаваць і ненароджанае дзіця, якое насіла пад сэрцам. І падобных сямейных гісторый тут нямала. Успаміны Канстанціна Валасюка захоўваюцца ў выглядзе выразкі з раённай газеты. Матэрыял быў апублікаваны ў газеце «Савецкае Палессе» ў пачатку 80-х гадоў.

І не толькі школа збірала і захоўвала звесткі пра ваенныя падзеі ў Задуб'і. Бібліятэкар таксама паспела апытаць некалькі ветэранаў вайны, старажылаў вёскі і афармляла гэтыя ўспаміны ў асобную папку. Цяпер матэрыялы захоўваюцца ў бібліятэцы. Імі карыстаюцца школьнікі, студэнты, якія пішуць курсавыя работы, іх выкарыстоўваюць для правядзення раённых мерапрыемстваў. Вось і пры падрыхтоўцы матэрыялу для праекта «Вогненныя вёскі. Нельга забыць», які працягваецца ў нашай газеце, стараста з Ганцаўшчыны таксама аказала дапамогу.

Ірына Валасюк мае намер з часам перавесці гэтыя матэрыялы ў лічбу, каб служылі яны справе гістарычнай памяці будучых пакаленняў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# РУХАВІК СЕЛЬСКАЙ АКТЫЎНАСЦІ

**Чаёўнічаць і абмяркоўваць новыя ідэі добраўпарадкавання роднага населенага пункта... Днямі самыя актыўныя жыхары гарадскога пасёлка Парычы Светлагорскага раёна атрымалі з рук старшыні Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярыны Зенкевіч адрасны падарунак — чайны сервіз.**
**Так актывісты калегіяльнага тэрытарыяльнага органа самакіравання, створанага ў Парычах, сталі аднымі з удзельнікаў цырымоніі ўшанавання найлепшых памочнікаў старшынь сельвыканкамаў і дэпутатаў сельсаветаў Светлагоршчыны.**

— Наш орган самакіравання на тэрыторыі Парыцкага сельсавета быў створаны восем гадоў таму і аб'ядноўвае 21 актывіста. Асноўная задача — дапамагаць вырашаць актуальныя праблемы нашых жыхароў пры супрацоўніцтве з сельскім саветам, акумуляваць ідэі, якія людзі мараць увасобіць у жыццё. Штогод збіраемся на суботнікі, наводзім парадак на нашай набярэжнай Бярэзіны — самым любімым месцы адпачынку жыхароў гарадскога пасёлка, — падзялілася **старшыня калегіяльнага тэрытарыяльнага органа з Парычаў Алена ХАНДЗЕЦКАЯ.**

Алена Васільеўна ад сябе асабіста і ад імя актывістаў роднага населенага пункта перадала словы падзякі за тое, што работу сельскіх актывістаў заўважаюць і цэняць, а гэта дае сілы і настрой працаваць.

Між тым падзякі і грашовыя ўзнагароды ад кіраўніцтва Гомельскага абласнога і раённага Саветаў дэпутатаў



Фота sn.by

атрымалі амаль тры дзясяткі памочнікаў старшынь сельвыканкамаў і дэпутатаў сельсаветаў. Ушанаванне актывістаў прайшло ў Доме культуры аграгарадка Чыркавічы Светлагорскага раёна.

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Зенкевіч уручыла памочнікам старшынь шасці сельсаветаў раёна падзячныя лісты за іх уклад у вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння, добраўпарадкаванне населеных пунктаў, ажыццяўленне мясцовых ініцыятыў на тэрыторыі Светлагорскага раёна. Нягледзячы на тое, што памочнікі старшынь сельвыканкамаў — людзі розных узростаў і прафесій, іх аб'ядноўвае любоў да роднага краю і шчырае жаданне, каб іх раён жыў і развіваўся, падзякавала вяскоўцам Светлагоршчыны кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна.

— Вы ўсім сэрцам хвareеце за родны край, гатовы прыйсці на дапамогу сваім землякам, выслухаць кожнага і дапамагчы. Вы — правая рука старшыняў сельвыканкамаў, іх верныя памочнікі: ведаеце, якія пытанні хвалююць мясцовае насельніцтва, з якімі праблемамі сутыкаюцца людзі і якія радасныя падзеі адбываюцца ў іх жыцці, — звярнулася да прысутных **старшыня Светлагорскага раённага Савета дэпутатаў Людміла ВЯЛІЧКА.**

Па яе словах, традыцыю ўшаноўваць актыўных, неабыякавых да жыцця свайго роднага краю людзей у раёне распачалі ў 2018 годзе. З-за эпідэміі каранавіруса святочнае ўшанаванне лепшых актывістаў на вёсцы вымушаны былі абмежаваць. Сёлета зноў гэтую традыцыю аднавілі.

— Спадзяюся, што ў нашым вялікім раёне з кожным годам будзе ўсё больш і больш людзей далучацца да актыўнай грамадскай работы на тэрыторыі сваіх сельсаветаў, — заклікала кіраўнік Светлагорскага райсавета дэпутатаў.

Праца на вёсцы немагчыма без узаемадзеяння з усімі службамі, арганізацыямі.

— Своечасова аказаная дапамога, падстаўленае плячо, цярпенне і разуменне — гэта тое, з чаго складаецца супрацоўніцтва і сумесная праца, — нагадала сельскім актывістам **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Светлагорскага райвыканкама Марына ГРАЮШАВА.** Яна падзякавала ўсім, хто прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці раёна, выступае з ініцыятывамі і прымае непасрэдны ўдзел у іх ажыццяўленні.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 20 снежня 2022 года.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Управляющая компания холдинга «Бобруйскагромаш», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Шинная, 5. УНП 700067572 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов**
**Адрес: Могилевская обл., Кировский р-н, Боровицкий с/с, аг. Боровица, ул. Центральная, 5А**

**СТОЛОВАЯ** (здание нежилое, инв. № 712/С-8788, **128 кв. м**).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0723 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания здания столовой. Ограничения (обременения) прав: зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения (пл. 0,0554 га)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 45 746,76 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (г. Минск), БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести лот по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере 6 % от цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.01.2023 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.01.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 412/С-27010 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание бани), площадью 180,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33 около д. Заполье.
ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081700001000293 (назначение – для строительства и обслуживания здания бани) площадью 0,2359 га по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33 около д. Заполье. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах рек и водоемов, код - 2.4, площадью 0,2359 га; земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0870 га; земли, находящиеся в придорожных полосах автомобильной дорог, код – 7.1, площадью 0,2359 га.
Начальная цена продажи – 8 211,74 руб. (восемь тысяч двести одиннадцать рублей семьдесят четыре копейки) с учетом НДС. Сумма задатка – 821,17 руб. (восемьсот двадцать один рубль семнадцать копеек)

Условия проведения аукциона – обязанность подписания и подачи в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» заявления о государственной регистрации и документов, необходимых для осуществления государственной регистрации договора купли-продажи, и основанного на нем права собственности на капитальное строение возлагается на покупателя; расходы по удостоверению договора купли-продажи капитального строения в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» возлагаются на покупателя

Продавец – ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», Филиал «Дубно», 231602, Мостовский р-н, аг. Дубно, ул. Октябрьская, 8, тел. 8-01515-606-68

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083322 5001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 09 января 2023 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/auktsionykopiya.
Объявление о проведении первого аукциона в газете «Звязда» от 25.08.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 05 января 2023 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 28 |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 922 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48248, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625484503101000991 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, г. Столбцы, ул. Якуба Коласа, 28А, наименование – здание гаража, 1-пристройка | 38 760,00 |
| 923 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48249, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625482402501000174 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Заямновский с/с, аг. Яблоновка, ул. Молодёжная, 1Б, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: А1/д-здание КПП, 1-пристройка, 2-сарай, 3-уборная | 7 440,00 |
| 924 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48250, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625482809601000094 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Литвенский с/с, аг. Рочевичи, ул. Центральная, д. 9, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: А1/д-здание КПП, 1-пристройка, 2-пристройка | 8 880,00 |
| 925 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48251, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625485802601000522 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Деревная, ул. Колхозная, д. 47А, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: А1/к-здание КПП | 21 480,00 |
| 926 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48252, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625485805101000125 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Деревнянский с/с, аг. Нивное, ул. Садовая, д. 18А, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: 1-пристройка, А1/д-здание КПП | 8 640,00 |
| 927 | Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48253, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625483404101000305 по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н, Налибокский с/с, аг. Налибоки, ул. Озёрная, д. 15А, наименование – здание КПП, составные части и принадлежности: А1/к-здание КПП | 12 000,00 |

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с: BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**
Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не **более 650,00 бел. руб.**

**Начала торгов по лотам № 922, № 923, № 924:** 23 января 2023 г. в 09.00 до 16.00.
**Начала торгов по лотам № 925, № 926, № 927:** 24 января 2023 г. в 09.00 до 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрация в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **21.12.2022 по 20.01.2023** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

Уважаемые акционеры ОАО «Элегант»
**27 декабря 2022 года в 12.00**
**состоится внеочередное общее собрание акционеров**

**Повестка дня:**
1. О выкупе на баланс Общества акций собственного выпуска.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22, бухгалтерия 27.12.2022 с 11.10 до 11.45. Справки по телефону (01775) 6-80-74.
Начало регистрации – 27.12.2022 с 11.00 по 11.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22 ОАО «Элегант», бухгалтерия.
Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 20 декабря 2022 года.
Для участия в собрании при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт; представителю акционера – паспорт и доверенность, заверенную в установленном порядке.

***Наблюдательный совет.***

УНН 600039318

УНП 500043292

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
извещает об отмене аукциона, назначенного на 28.12.2022 г. по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродненский мясокомбинат».
ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-32608 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – универсам), общей площадью 4 829,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, пр-т Янки Купалы, 49.

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк строгой отчетности по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств» формы ОГО, серии МА № 5251079 в количестве 1 экземпляра и бланка строгой отчетности квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии ВА № 4949646 в количестве 1 экземпляра **считать недействительными.**

УНП 100122726

## Надрукавана ў «Маладосці»: снежань 2022

# Ад Усяслава Брачыслававіча да сучаснай матэматыкі




У дванаццатым нумары «Маладосці» знайшлося месца творам як маладых, так і сталых аўтараў. Адкрываецца часопіс навагоднімі навеламі-гісторыямі Андрэя Сідарэйкі «З чыстага аркуша». З лірычнай паэмай «Крыгі» выступае Алёна Папко. Падборкай вершаў «Снегавы магніт» вядзе свой дыялог з чытачом добра вядомы айчыннаму чытачу Віктар Ярац. З вершамі ў «Маладосці» выступаюць і Наталля Суботка, Навум Гальпяровіч, Ангеліна Варатынская.

Хацелася б усім параіць прачытаць апавяданні Алены Бравы, аб'яднаныя ў падборку «Кава на пяску» («Канапа», «Ганеша», «Сабакі Гекаты»). Пісьменніца, якую па праве можна лічыць «маладосцеўскім» аўтарам (на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў яна друкуе сваю прозу менавіта ў гэтым выданні), вельмі ашчадная ў карыстанні словам, вельмі пільна і востра ўзіраецца ў жыццё, адлюстроўвае яго праз выразныя дэталі. Проза Алены Брава — творчасць са сваім, адметным почыркам. Ліна Мрагі, вядомая як аўтар рамана-фэнтэзі «Для смаку дадаць кары, альбо Каталізатар для планеты», выступае ў снежаньскім нумары з апавяданнем «Негабарытны груз».

Друкуюцца ў нумары і пераклады «Прытч» Роберта Стывенсана. Пераклаў тэксты сусветна вядомага пісьменніка з англійскай мовы Валерый Пшыгодскі.

Вітаўт Чаропка праз «штрыхі да летапіснага партрэта» знаёміць з легендарнай гістарычнай асобай «Вешчая душа князя Усяслава Полацкага». Нагадаем, што князь Усяслаў Брачыслававіч правіў Полацкім княствам 57 гадоў (!). «Каб рэканструяваць біяграфію Усяслава Полацкага, нам давядзецца звярнуцца не толькі да вядомых летапісных фактаў, але і да тлумачэнняў даследчыкаў «Слова пра паход Ігаравы» і былін, праобразам якіх стаў полацкі князь, да версій і здагадак. Гэта толькі надае інтрыгі і цікавасці для яго жыццеапісання», — зазначае вядомы гістарычны пісьменнік і публіцыст Вітаўт Чаропка. Васіль Зуёнак прысвяціў сваё эсэ акадэміку Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі літаратуразнаўцу і празаіку Уладзіміру Гніламёдаву — «Ля паэтычнага вогнішча». У снежні 2022-га ва Уладзіміра Васільевіча — 85 гадоў з дня нараджэння.

Адметнай публікацыяй нумара можна лічыць урыўкі з кнігі вядомага публіцыста і вучонага Аляксандра Радзькова «Пра матэматыку і матэматыкаў». Сама кніга пабачыць свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» найбліжэйшым часам.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ФХ «ОмаровАгро», УНП 591345825, 231315, Гродненская область, Лидский район, с/с Белицкий, д. Поречье, д. 108 |

**Публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 154Б2279 в экономическом суде Гродненской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение (назначение – здание специализированное здание розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 897,4 кв. м, инвентарный номер 420/С-65874, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, аг. Белица, ул. Красноармейская, 9 | 12 500,00 |
| 2 | Капитальное строение (назначение – здание специализированное общественного питания, наименование здание столовой), общей площадью 472,3 кв. м, инвентарный номер 420/С-69314, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, аг. Белица, ул. Красноармейская, 6 | 6 600,00 |

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальных сайтах ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by, на интернет-сайте https://bankrot.gov.by

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 20.01.2023, начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00, проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 19.01.2023 г. до 17.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

# У ЧЫМ ВЫМЯРАЕЦЦА ШЧАСЦЕ

**Мы звалі яе Наймудрэйшай, бо як жа яшчэ, калі год нараджэння — 1925-ы, калі змалку сірата і нянька для меншых братоў і сястрычак, калі працаўніца і пісьменніца, кандыдат навук, калі двойчы ўдава (першы муж загінуў на вайне, другі — так рана памёр), калі столькі ўсяго перажыла, прачытала і ўбачыла!**

**...У тыя хвіліны мы глядзелі разам — на шумную рэчку, на расквечаны луг, на дыхтоўны дом на высокім пагорачку.**

**— Жывуць жа людзі!.. Шчаслівыя! — пазайздросцілі яго жыхарам. — Такая прыгажосць пад вокнамі!**

**— Але ж шчасце не ў ёй, — сказала пісьменніца.**

**— ?**

**— Шчасце ў тым, здаровы ты ці хворы, малады ці стары, з кім жывеш і на якія грошы, чым займаешся...**

**Што, вядома ж, так, бо дом пабудаваць (пры ўсёй складанасці!) куды прасцей, а вось жыццё...**

**Што крыўдна, абсалютная большасць будаўнікоў нават праектаў не мае. Хіба так — лёгкія накіды.**

## Не пра дах

Гэтыя выпускнікі-аднакласнікі — як многія — абяцалі сустракацца штогод, але...

Сустрэліся (хоць не ўсе) толькі налета, потым — праз пяць гадоў, хто-ніхто праз дзесяць і нават праз... сорак! З двух класаў аж пятнаццаць чалавек сабралася — пераважна «дзяўчат».

Праўда, «хлопцы» таксама былі. І нават зрабілі ўсё па-даросламу, па-мужчынску: прывезлі на сустрэчу любімых настаўнікаў, загадзя замовілі сталы ў рэстаране...

І як жа хораша пасядзелі: пагаварылі, паўспаміналі, а «дзяўчынкі» — дык тыя нават пасакрэтнічаць паспелі!

...Адна з іх расказала, як заказала («дах падчыстую знесла»!), як пакінула дом і дзяцей, як паехала на край свету, як жыла там, што называецца, на разрыве паміж сапраўдным і пакінутым, як яно, тое апошняе, стала ўсё больш перацягваць, і як тады першы муж сказаў ёй: «Кінь дурное і вяртайся. Ні ў чым не папракну»...

Санта-Барбара карацей: «дзеўкі» слухалі ўсё, стаіўшы дыханне! Адна дык нават слязу пусціла.

— Ды не трэба мяне шкадаваць! — сказала ёй апавядальніца.

— А я не цябе, не! — шмыгнула носам аднакласніца. — Я... сябе шкадую: ні разу ў жыцці мне «даху не зносіла»... І ўжо не знясе.

## Урок?

Паводле анекдота, у жыцці мужчыны першыя сорак гадоў самыя складаныя.

Сяргею пакуль чатыры, і кожны з іх ён лёгка пражыў.

Не так даўно ў вёску прыехаў, дзе бабуля яго і дзед, дзе знаёмая карова, куры, свінні... Адна — дык нават з парасятамі — прыгожымі, рухавымі!

Малы і раней іх бачыў. Каб паглядзець ізноў, куляй панёсся ў хлеўчык.

А прыбег і стаў: няма парасятак.

— Дзе? — спытаў гаспадыню.

— Свіння прагнала, — адказала чамусьці тая.

— За што?! Яны не слухаліся?!

Бабуля штосьці казала, але ўнук, здаецца, не чуў: ён пайшоў думаць... Яшчэ і над тым, што з бабуляй, магчыма, дрэнныя жарты.

## Таямніца? Ці нават дзве?

Свайго мужа Дзяніса Ядзя заве па-рознаму: Дзень, Дзянёк, Дзянёчак... Больш ласкавых слоў яна таксама не баіцца (асабліва, калі нешта просіць...). Ну вось напрыклад:

— Ка-ха-не-нькі, — прыпаўшы бюстам да ягонай спіны (муж на кухні сядзіць, кісель дапівае), шэпча на вушка жонка. — Ты выпадкова не забыўся, што хутка ў нас — свята, гадавіна вяселля?

— Не, — коратка адгукаецца той і насцярожана дадае: — А ты што, у ювелірны схадзіла?

— Ну дапусцім.

— Сёмы пярсцёнак намерала?

— А хоць бы і так!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Ну тады скажы, — кісель дапіты, кубак рашуча адстаўлены, — а навошта ён?

— Не скажу...

— Чаму?

— Ну ты ж таксама не скажаш, навошта табе дзясятая вудачка?

## Цуд дый годзе!

З лiста, якi не выкiнуць, не спiсаць у архiў: «...Флюгеры — гэта прыборы, якія паказваюць напрамак ветру, і гэта людзі, што па тых напрамках трымаюць насы, бо прынцыпаў — аніякіх: скажы ім, што рэлігія — опіум, што храмы трэба бурыць, — пойдуць на гэта першымі, скажы, што час аднаўляць, — ізноў «ухвалямс»...

У нас загадчык райана такі быў. Старэйшае пакаленне мо помніць яшчэ, як Хрушчоў вяскоўцам «палёгку» зрабіў — даў каманду пазводзіць гаспадарку, да гародчыкаў абрэзаць соткі.

Дык вось, выступае той загадчык райана перад настаўнікамі ды абураецца (даслоўна): «Сельская інцілігенцыя!.. Заязджаю ў школу, а дзірэктар вместа таго, што б на ферму ці на поле пайсці — лекцыю пачытаць, бяседу з людзьмі правесці — у гумовіках вёдры таскае, парсюков сваіх корміт»...

Але ж прайшоў час і вяскоўцам вярнулі гароды, змянілася ўлада, але не змяніла таго загадчыка. Ён зноў выступае і зноў абураецца: маўляў, «сельская інцілігенцыя саўсем зазналась... Прыязджаю ў школу-васьмілетку, а дзірэктар, вместа таго, каб пример паказаць калхознікам — кароўку завесці, двух ці трох кабанчыкаў карміць, нічога не імеіць, сядзіць пад яблынькай і ліцеpатуру художэственную чытаець».

...Заключная фраза ў гэтым лісце: «Думаю, колькі ж разоў людзей вось гэтак гнулі, ламалі, вучылі-перавучвалі, выхоўвалі. А прыстойныя сярод іх усё роўна заставаліся».

## Каб на хмель не мароз...

«Молодо — зелено» — кажуць суседзі-расіяне, беларусы пра тое ж — «Маладосць — дурносць».

Наташы не было 20, Максіму — трохі больш. Сустрэліся, закахаліся... А яна — дык нават без памяці, бо праз тыдзень-другі засталася ў яго начаваць, праз месяц — пераехала і, як ёй здавалася, — назусім.

Птушкай лётала па здымным пакоі, гатавала, прыбірала, мыла, падавала... Закінула вучобу і нават кінула б, бо навошта, калі можна і так: пайсці працаваць (кім — якая розніца?), галоўнае — прыбягаць дадому, дзе ЁН, яе Максім, дзе...

Пра цяжарнасць яна маўчала: спачатку — не магла паверыць, хацела ўпэўніцца, што гэта праўда, потым — пачакаць нейкага зручнага моманту, адметнага дня.

У той — было роўна паўгода, як яны пазнаёміліся. Гэта па-першае. Па-другое, яна атрымала стыпендыю, па-трэцяе, купіла новую кофтачку. А да яе — гуляць дык гуляць — шампанскага і трохі прысмакаў, зрабіла святочны стол, прыбралася, уключыла музыку.

— З якой нагоды банкет? — спытаў Максім.

— Ну, як жа? Ты забыўся? — зашаптала яна, абняўшы. — Сёння ж — роўна паўгода, шэсць месяцаў, як мы разам! А праз шэсць...

— Што «праз шэсць»? — насцярожыўся хлопец, разняўшы яе абдымкі.

— У нас будзе маленькі! — выдала яна. — Ці маленькая... Ты рады?!

— Я?! Не, — ухмыльнуўся Максім. — Мне дзіця не патрэбна...

— Як гэта не-е-е? — пачала яна, адчуваючы, як цямнее ў вачах і з-пад ног «сыходзіць» падлога.

— Ды проста: не патрэбна і ўсё, — адрэзаў Максім.

— Ну тады і мне не патрэбна! — неяк міжволі, на аўтапілоце кінула яна.

Кінула спачатку — словы, потым — (ніхто не спыніў!) ключы ад пакоя, вучобу ў інстытуце, дзіця ў радзільні... З'ехала ў іншы горад, знайшла работу, атрымала пакой у інтэрнаце, а гадоў праз дзесяць — сваю, асобную кватэру...

Замуж так і не выйшла, а з суседзямі добра жыла.

...Менавіта яны заўважылі, што ўсю ноч у вокнах святло, а самой не відаць-не чуваць, менавіта яны, адшукаўшы сваячку з ключамі, адамкнулі дзверы і ўбачылі, што спазніліся.

Потым казалі, што памерла рана (45... Якія гады?!), што падвяло сэрца, а найболей тое, што жыла адна: калі б з ёю хоць нехта быў...

Што крыўдна — мог: той самы хлопчык, сын.

Дзеля яго хоць-нехаць (трэба ж гадаваць, зарабляць, прыбіраць, адпраўляць у садок і ў школу...) маці, напэўна, скончыла б інстытут (хай завочна), напэўна, зрабіла б якуюніякую кар'еру, напэўна, па-іншаму б жыла: у клопатах, у радасці...

Ад чаго — ну напэўна ж! — з форсам насіла б галаву і НЕ насіла б камень на сэрцы.

Напэўна, выйшла б замуж і нарадзіла некага яшчэ...

Страшнае слова «позна»: нічога не пераробіш.

Руская прымаўка: «Незрел виноград не вкусен, млад человек не искусен», наша — «Каб на хмель не мароз, ён бы тын перарос».

## «Если бы молодость знала...»

Раніцай па буднях ці не ўсё дарослае насельніцтва прыгарадных вёсак, гарадоў і мястэчак едзе ў Мінск — на вучобу, работу, бліжэй да вечара яно ж, тое насельніцтва, вяртаецца назад: сесці ў электрычцы няма дзе. Ці ўсё ж...

— Тут занята, — строга папярэджвае нейкая «пані ў гадах».

— Усё? — удакладняем з надзеяй.

Пытанне жанчыне яўна не падабаецца, бо прымушае-такі пасунуцца і адно месца вызваліць. Другое (насупраць) яна працягвае «трымаць», прычым — да апошняга: у вагон перад самым адпраўленнем цягніка «ўлятае» яе чаканы — высокі, сівы, расчырванелы...

— Дзе ты быў? Дзе твой тэлефон? — шыпіць на яго жанчына.

— Ды я... Ды ты..., — пачынае лапатаць чаканы, выціраючы пот, здымаючы шапку-вушанку, шалік...

— Ты б яшчэ кажух усцягнуў! — аж зелянее ад злосці яго спадарожніца. — Сёння ж цёпла!

— Мілая, дык я ж званіў — пытаўся, што апрануць? Ты сказала: «Хоць што». Дык я во гэтую куртку...

Пад ёй, дыхтоўнай, пуховай (мужчына памалу расшпіляўся) быў пінжак, пад пінжаком — світар.

— Ну далібог, як дзіця! — немаведама каму расказвала «мілая». — Абы-як апрануўся, тэлефон не ўзяў, у цягнік ледзь паспеў... Можа, і хлеба не купіў?

— Не, ну што ты! — узрадаваўся мужчына. — Хлеб ёсць! Праўда, не той, што ты хацела. Гэтага (муж дастаў з кішэні цыдулку) не было, быў таннейшы. Тры булкі ўзяў...

— Навошта?! Мы што — сушыць іх будзем?! — выходзіла з сябе жонка.

— Мілая, ты злуешся. Ну што я зрабіў не так? — пытаў стары.

— Усё! — абарвала яго жанчына, адвярнулася да акна і тым самым дала зразумець, што размова скончана.

...Далей і сапраўды яны ехалі моўчкі: можа, крыўдавалі адно на аднаго, можа, успаміналі, якія былі шчаслівыя (ён — ажаніўшыся з маладзейшай — гадоў на 30, яна — выходзячы замуж за старэйшага, відаць, прыгожага і не беднага)...

А можа, думалі, што жыць ім было добра, а вось дажываць... Як пісаў знаёмы гумарыст:

*Мы гэткіх шлюбаў многа знаем:*
*На кветках жэняцца пчалы,*
*І тым карчам мы спачуваем,*
*Але не можам памагчы.*

## Аб'ект асобага прызначэння

Падстава для зайздрасці (ці прыклад для пераймання?): нейкі чалавек дом будаваць узяўся — на пагорку, на ўскрайку вёскі. Ды вялікі, дыхтоўны, драўляны...

І грошай на яго, відаць, не накраў, бо «аб'ект» ад людзей не хавае («празрыстай» сеткай участак абнёс). А значыць, хадзі хто хочаш ды глядзі, як да толку, як па-майстэрску ўсё там робіцца: як падрастаюць сцены (ужо і хлеўчука), як ставяцца кроквы і зашываюцца франтоны...

З любоўю сядзібка будуецца — для сябе, відаць, для сваёй сямейкі.

Ці для іншых таксама? Каб бачылі, што гэта магчыма! Каб таксама хацелі... Ці хоць бы марылі...

## У чым вымяраецца шчасце

...Кавярня, абед, гучнае пытанне:

«Э-э, хто «Мерседэс» на ўваходзе паставіў?!»

І ў адказ на яго зусім ціхае:

— Чаго ты равеш? Гэта ж твая машына.

— А можа нехта не ў курсе?!

Гэта — анекдот, пра Ветачку, бо яна, здаецца, усім ужо расказала, што «дзве машыны з'ездзіла», што цяпер ёй трэцюю падагналі...

— Добра табе... Шчаслівая... Багатая — наперабой зайздросцяць сяброўкі, бо...

На пачатку жыцця, у іх 20-25, шчасце ды багацце, відаць, і сапраўды можа вымярацца ў машынах. А вось потым, напрыканцы...

Хіба ў колькасці людзей (пажадана побач!), якіх любіш ты і якія любяць цябе.

Паводле кітайскай прымаўкі, маючы грошы, можна зрабіць вельмі многае: купіць гадзіннік, але не час, ложак, але не спакой, доктара, але не здароўе, месца пад сонцам, але не павагу, жытло, але не дом...

**Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж:**

*Апошнія лісткі ў календарах...*
*Сыходзіць год —*
*самотны і стары.*
*Ніхто яго за фалды не трымае:*
*Навошта, калі Новы наступае...*

*І верыцца, што гэты — не падмане:*
*Усё, што трэба —*
*з-пад зямлі дастане!*
*Каму — здароўе без ніякіх лекаў,*
*Каму да пары — цуда-чалавека.*

*Па сэрцы справу*
*з добраю зарплатай,*
*Якой сям'і хапала б на ўсе траты,*
*Асобны дом —*
*хай для пачатку й цесны,*
*Але ж каб там*
*спявалі дзеткам песні...*

*Яшчэ — машыны...*
*Водпуск, дзе хто хоча,*
*Паўнюткія лагоды дні ды ночы,*
*Усім —*
*дабра, цяпла і ласкі Божай,*
*З якою ўсё ліхое пераможаш...*

*Апошнія лісткі ў календарах...*
*Сыходзіць год —*
*самотны і стары.*
*Ніхто яго за фалды не трымае:*
*Навошта, калі Новы наступае...*

Каго мы бачым!

# «Вялікае дзіцяня жывёлы»

## У Канадзе знайшлі ўнікальную мумію маманта



**Па словах навукоўцаў, астанкі дзіцяці мамантa праляжалі ў вечнай мерзлаце больш за 30 тысяч гадоў. Пра гэта паведамляе Science Alert. Паводле прэс-рэлізу мясцовага ўрада, самка мамантаняня была названая Тр'ондэк Хвэч'ін Нун чо га, што на мове хань перакладаецца як «вялікае дзіцяня жывёлы».**

Нун чо га памерла і была замарожана ў вечнай мерзлаце падчас ледніковага перыяду, які адбыўся больш за 30 тысяч гадоў таму.

Замарожаны мамант быў знойдзены геолагамі пасля таго, як малады шахцёр на залатых капальнях Кландайка знайшоў астанкі падчас раскопвання гною. Палеантолагі гавораць, што шахцёр зрабіў «найважнейшае адкрыццё ў палеанталогіі ў Паўночнай Амерыцы».

Як паведамляецца, у мамантаняці захаваліся кіпцюры, шкура, поўсць, тулава і нават кішкі, напоўненыя травой.

Тэхналогіі будучыні

# «Падкавалі», як блыху, нагрэвам

## Створаны самы маленькі ў свеце робат-краб

**Інжынеры Універсітэта Нортуэстэрн (ЗША) распрацавалі робата-краба, якога яны назвалі самым маленькім у свеце робатам, здольным рухацца. Па словах спецыялістаў, распрацоўка можа падштурхнуць навуку да стварэння мікраскапічных робатаў, якія могуць выконваць практычныя задачы ў цеснай абмежаванай прасторы. Пра гэта паведамляе выданне Science Daily.**



Робат мае памер каля паловы міліметра — ён крыху менш звычайнай блыхі. Мікраробат можа згінацца, выгінацца, поўзаць, хадзіць, паварочвацца і нават скакаць. Пры стварэнні навукоўцы выкарыстоўвалі асаблівы матэрыял з эфектам памяці, які мяняе сваю форму пры нагрэве. Каб прымусіць робата крочыць, спецыялісты апраменьвалі яго лазерам.

«Наша тэхналогія забяспечвае розныя спосабы кантраляванага руху — робат можа хадзіць з сярэдняй хуткасцю, роўнай палове даўжыні цела, у секунду», — адзначыў вядучы аўтар даследавання Юнган Хуанг. Па словах спецыялістаў, яны маглі стварыць мікраскапічнае ўстройства любой формы, аднак распрацаваць робата-краба хацелі студэнты, якія ўдзельнічалі ў даследаванні.



**Даследчыкі-егіптолагі развянчалі міф аб таямніцы праклёну фараона Тутанхамона: насамрэч яго не было. Як піша выданне Telegraph, гаворка аб праклёне была прыдумана егіптолагам і журналістам Daily Mail Артурам Вейгалам, які быў пакрыўджаны тым, што эксклюзіўная гісторыя аб выяўленні грабніцы Тутанхамона патрапіла ў Times.**

Пласты гісторыі

# Сенсацыйны ракурс адкрыцця

## Навукоўцы разгадалі таямніцу праклёну фараона

Брытанскі археолаг Говард Картэр выявіў грабніцу егіпецкага фараона 4 лістапада 1922 года, а ў лютым наступнага года разам з брытанскім вучоным Джорджам Карнарвонам увайшоў у пахавальную камеру Тутанхамона. Тады грабніца ўсё яшчэ была цэлая і поўная скарбаў.

На працягу шасці тыдняў пасля адкрыцця Карнарвон памёр, пасля чаго была серыя загадкавых смерцяў людзей, якія тады альбо працавалі на раскопках, альбо наведвалі грабніцу. У выніку мноства газет пачалі пісаць артыкулы, дзе меркавалі, што гэтыя людзі сталі ахвярамі старажытнага праклёну.

Цяпер, як піша выданне, у новым дакументальным фільме Channel 4 сцвярджаецца, што чуткі аб праклёне былі прыдуманыя Артурам Вейгалам. У дзень адкрыцця грабніцы Вейгал пачуў жарты Карнарвона, які рыхтаваўся ўвайсці ў пахавальную камеру, што пампрэ на працягу шасці тыдняў, калі будзе і далей выказваць такую непавагу да фараона.

Калі прароцтва спраўдзілася, і Карнарвон памёр з-за пнеўманіі і заражэння крыві, выкліканых укусам камара, Вейгал ухапіўся за шанц атрымаць новы сенсацыйны ракурс адкрыцця. Пасля смерці Карнарвона ўслед адбылася яшчэ серыя смерцяў тых, хто быў датычны да раскопак. Гэта ўсё асвятлялася ў сусветнай прэсе, што спрыяла стварэнню міфа аб праклёне фараона.

Большасць навукоўцаў падкрэсліла, што многія іншыя людзі, якія наведалі грабніцу або дапамаглі яе выявіць, пражылі доўгае і здаровае жыццё. «Насамрэч некаторыя са смерцяў маглі быць справакаваны бактэрыямі з грабніцы, якія паразілі людзей, што ўжо пакутавалі на хранічным захворванні лёгкіх», — растлумачылі даследчыкі.

Здароўе на талерцы

# У барацьбе з атлусценнем

## Даследчыкі вынайшлі «цукар для пахудзення»

**Навукоўцы Вяцкага дзяржаўнага ўніверсітэта знайшлі спосаб атрымання салодкага бялку бразеіна, які з'яўляецца бясшкодным заменнікам цукру. Распрацоўка павінна стаць альтэрнатывай вугляводным цукрам ва ўсім свеце і ўнесці ўклад у барацьбу з атлусценнем, паведамілі «Известиям» у прэс-службе ўніверсітэта.**



Як растлумачылі эксперты, бразеін уяўляе сабой бялок, які прыкладна ў 2000 разоў саладзейшы за цукар. Распрацоўка прамысловай тэхналогіі яго вытворчасці з'яўляецца адным з эфектыўных спосабаў скарачэння ў харчовых прадуктах так званага ўтоенага цукру, зніжэнні іх каларыйнасці і барацьбы з атлусценнем.

Прарэктар па навуцы Вяцкага дзяржуніверсітэта Сяргей Літвінец адзначыў, што распрацоўка шырокай лінейкі нізкакаларыйных прадуктаў патрабуе эфектыўных тэхналогій вытворчасці бразеіну.

«Таму нашы ідэі ў першую чаргу накіраваныя не на атрыманне самога салодкага бялку, а на распрацоўку тэхналагічных рашэнняў, якія дазваляюць зменшыць кошт атрыманага прадукту. На першым этапе пры дапамозе метадаў бялковай інжынерыі мы сканструявалі генетычныя канструкцыі для біясінтэзу мутантавых формаў бразеіна, якія больш чым у 2000 разоў саладзейшыя, чым цукрозы. Сыравіна, бялок, вытворчасць — усё айчыннае, і галоўнае, што прадукт будзе айчынны. Гэта даследаванне ўнікальнае для Расіі», — падкрэсліў ён.

Паводле слоў эксперта, у далейшым вучоныя плануюць распрацоўку генна-інжынернага прадуцэнта, а таксама эфектыўнай тэхналогіі выдзялення і ачысткі. Работа цяпер на стадыі зборкі генетычных канструкцый і падбору аптымальных генетычных элементаў, якія забяспечваюць высокі выхад мэтавага прадукту, дадаў Літвінец.

Уся работа ў гэтым напрамку вядзецца ў рамках стратэгічнага праекта ВНУ «Тэхналогіі здароўя» па праграме «Прыярытэт 2030».

Ад пачатку свету

# З-за харчовай канкурэнцыі...

## Вучоныя распавялі аб прычынах знікнення мегаладона

**Самая вялікая з акул мегаладон, якая жыла калі-небудзь, магчыма, вымерла з-за прайгранай канкурэнцыі з вялікай белай акулай. Такія высновы навукоўцаў з Універсітэта Дэ Поля ў Чыкага апублікаваў партал Indy.**

Як паведамляе выданне, даследаванне астанкаў мегаладона выявіла наяўнасць цынку ў зубах гэтых акул, што перасякаецца з аналагічнымі вынікамі аналізаў узораў зубоў вялікіх белых акул, якія жылі ў той жа перыяд, што і мегаладоны.

«Гэтыя вынікі, верагодна, маюць на ўвазе прынамсі некаторае супадзенне ў здабычы, на якую палююць абодва віды акул... Нягледзячы на тое, што неабходны дадатковыя даследаванні, нашы вынікі, відаць, пацвярджаюць магчымасць дыетычнай канкурэнцыі мегаладона з вялікімі белымі акуламі ранняга пліяцэна», — прыводзіць выданне словы даследчыка Універсітэта Дэ Поля Кешну Шымады.

Мегаладон — від вымерлых акул з сямейства Otodontiae, які існаваў у перыяд міяцэну і пліяцэну і лічыцца самым вялікім па памерах з калі-небудзь існаваўшых акул. Агульная даўжыня цела мегаладонаў, паводле ацэнак навукоўцаў, даходзіла да 15 метраў, а маса цела — да 47 тон.



**Сяргей СТАРЫНАЎ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by)** |
| **Предмет электронных торгов** | |
| **Лот № 1** Адрес**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 164** | |
| Здания и сооружения овощехранилища в составе: **картофелехранилище** (3052,4 кв. м, 710/С-60715), **КПП овощехранилища** (8,1 кв. м, 710/С-58338), **ограждения** (98,20 м, 710/С-81026; 138,18 м, 710/С-57185), **площадка** (3461 кв. м, 710/С-73308), **автомоб. дорога** (362 кв. м, 710/С-73307), ограждение для мусор. контейнеров (инв. № 13002000482), шкаф ШП-1 (инв. № 03386400001), щиты автоматич. (инв. № 03387000008, 03387000009, 03387000010). ***Сведения о земельном участке*: пл. 0,9248 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания картофелехранилища | |
| **Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 271 032,34 бел. руб.** (снижена на 40 %) | |
| **Лот № 2** Адрес**: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гагарина, 12** | |
| Столовая в составе: **столовая** (2098,2 кв. м, 710/С-57661, составные части: подвал, 4 крыльца, ворота, асфальтное покрытие, забор), **склад** (125 кв. м, 710/С-60480), **склад кирпичный** (97,8 кв. м, 710/С-76250), **ограждение площадки для мусора** (710/С-57176), **тепловая сеть** (20,2м, 710/С-79760), оборудование и ТМЦ – перечень на сайте ipmtorgi.by. ***Сведения о земельном участке*: пл. 0,6237 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений по хранению и переработке продуктов питания | |
| **Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 321 105,78 бел. руб.** (снижена на 50 %) | |
| **Лоты № 3** | |
| **Павильон торговый 10*4*3, 2011 г. в.** (инв. № 13001000005). Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское | |
| Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка лота № 3 проводится за счет покупателя | |
| **Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 12 455,12 бел. руб.** | |
| Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 1 % до 10 % от итоговой цены лота**, указанных в информации об аукционе на сайте ipmtorgi.by, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 09.11.2022 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.01.2023 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка подана менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 12.01.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)** | |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-23; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| Предметы торгов | Начальная цена (с учетом НДС), руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **Лот № 1:** прицеп специальный платформа SAT 133, год выпуска – 2010 г., регистрационный знак А 8643 А-1 | 9 120,00 | 912,00 |
| **Лот № 2:** автобус-вагон «УРАЛ-ЗАС-4951», год выпуска 1990 г., регистрационный знак АС5977 | 8 760,00 | 876,00 |
| **Лот № 3:** экскаватор-бульдозер «Амкодор 702ЕМ-02», год выпуска 2008 г., регистрационный знак АК-1 6749 | 14 040,00 | 1 404,00 |

**Продавец:** ОАО «Стройгаз, г. Брест», г. Брест, ул. Я. Купалы, 108К, тел./ф. 80162340466. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел. 80162 40 87 01. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ №116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** предоплата 100 % в течение 5 (пяти) дней с даты заключения договора купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

**Аукцион состоится 24 января 2023 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 80162 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 января 2023 г. до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 5 января 2023 г. в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

| № п/п | Наименование объектов продажи в лоте | Описание | Начальная цена продажи снижена на 60 % и составляет без учета НДС 20 %, белорусских рублей | Задаток, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|
